WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

16 КРАСАВІКА 2010 г.
ПЯТНІЦА
№ 73
(26681)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПРАДОЎЖЫЎ ЗНАЁМІЦЦА З СІТУАЦЫЯЙ У ПАЎДНЁВЫХ РЭГІЁНАХ БЕЛАРУСІ

Кіраўнік дзяржавы праінспектаваў ход веснавой сельскагаспадарчай кампаніі, даў шэраг даручэнняў кіраўнікам мясцовых органаў улады па навядзенні парадку на зямлі, арганізацыі меліярацыйных работ, вырашэнні задач сацыяльна-эканамічнага развіцця Прыпяцкага Палесся.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Чацвёра кіраўнікоў «Белінтэркул» абвінавачваюцца ў крадзяжы 1,7 мільярда рублёў, ухіленні ад мытных і падатковых плацяжоў на суму Br2,8 мільярда і легалізацыі 35 мільярдаў рублёў

**Паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС.**

ТАА «Белінтэркул», адзначаюць у міністэрстве, на працягу апошніх 10 гадоў з'яўлялася буйнейшым пастаўшчыком у рэспубліку сістэм вентыляцыі, кандыцыянавання і камплектуючых да іх. Акрамя таго, таварыства ажыццяўляла і большасць пуска-наладачных работ па мантажы такіх сістэм на прадпрыемствах. Праўда, як выявілася, ажыццяўляла злачынным шляхам. Так, абсталяванне сусветных вытворцаў набывалася ў Расіі і па «шэрых схемах» увозілася ў Беларусь без мытнага афармлення. Для «адмывання» грошай былі набытыя 3 замежныя кампаніі, зарэгістраваныя на Кіпры і Брытанскіх Віргінскіх астравах, а кіраванне рахункамі ў банках ажыццяўлялася дыстанцыйным шляхам праз інтэрнэт. Абвінавачаныя таксама злоўжылі даверам 89 арганізацый краіны — яны махлярскім шляхам наўмысна завышалі кошт мантажных работ пры ўстаноўцы на прадпрыемствах-заказчыках сістэм вентыляцыі і кандыцыянавання. У расцэнкі ўключаўся кошт выпрабавання крыягенных трубаправодаў з экранна-вакуумнай ізаляцыяй, якія не выконваліся. У Мінску арыштавана 7 аб'ектаў нерухомасці зламыснікаў на суму 7,5 мільярда рублёў.

**Ігар ГРЫШЫН.**




Старшы інспектар ДАІ Шчучынскага РАУС Андрэй ШЭРШАНЬ прымацоўвае адбівальныя элементы на павозку.

**Супрацоўнікі ДАІ Шчучынскага РАУС 15 красавіка правялі тэхнічны агляд гужавых транспартных сродкаў на тэрыторыі Ражанскага сельскага Савета. Асаблівую ўвагу інспектары надалі наяўнасці на павозках адбівальных элементаў. Тэхнічны агляд гужавых транспартных сродкаў не абавязковы, але ўжо трэці год запар вяскоўцы добраахвотна прыязджаюць у прызначаны дзень, каб паказаць свой транспартны сродак.**

## Цэны на свініну павышаныя

**Дакладней, з сённяшняга дня павялічыліся гранічныя адпускныя цэны на свініну на 2 працэнты і патушную ялавічыну на 3 працэнты.**

Як адзначаюць у Мінэканоміцы, гэтае рашэнне прынятае па прапанове Мінсельгасхарчу з мэтай паэтапнай кампенсацыі падаражання мясной сыравіны ў сувязі з павелічэннем закупачных цэнаў на буйную рагатую жывёлу і свіней. Акрамя таго, гэта дазволіць скараціць стратнасць рэалізацыі ялавічыны і свініны на ўнутраным рынку.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КІРАЎНІК ЧАСОВАГА ЎРАДА КЫРГЫЗСТАНА ЗАПАТРАБАВАЛА СУДА НАД БАКІЕВЫМ



**Кіраўнік часовага ўрада Кіргізіі Роза Атунбаева запатрабавала суда над прэзідэнтам Курманбекам Бакіевым, які зараз знаходзіцца ў выгнанні на поўдні краіны, паведамляе AFP.**

Паводле слоў Атунбаевай, Бакіеў павінен паўстаць перад судом, паколькі «праліў кроў». Кіраўнік урада лічыць, што ў дадзеным выпадку ён не зможа разлічваць на імунітэт ад крымінальнага пераследу. Сваякі і найбліжэйшыя прыхільнікі прэзідэнта, паводле яе меркавання, таксама павінны быць падвергнуты суду. Такую заяву кіраўнік часовага ўрада зрабіла пасля сустрэчы з прадстаўніком ЗША Робертам Блэйкам. У дадзены момант, паводле слоў Атунбаевай, Бакіеў знаходзіцца ў Джалалабадскай вобласці пад аховай прыблізна 500 узброеных прыхільнікаў. Новыя ўлады краіны не маюць намеру праводзіць ваенную аперацыю па захопе прэзідэнта, паколькі, паводле слоў кіраўніка службы нацыянальнай бяспекі Кыргызстана Кенешбека Душабаева, настроеныя на мірнае рашэнне пытання. Напярэдадні Бакіеў заявіў пра гатоўнасць падаць у адстаўку пры ўмове атрымання гарантый бяспекі для яго і яго сям'і.

### БАЛГАРЫЯ ПАЗБАВІЦЦА АД УРАДАВАГА ТУ-154



**Урад Балгарыі прадасць самалёт Ту-154, які на працягу 22 гадоў служыў для перавозкі вышэйшых асобаў дзяржавы, паведаміў міністр транспарту Аляксандр Цвяткоў.**

Міністр растлумачыў, што самалёт выкарыстоўваўся толькі для паездак за межы Еўрасаюза, паколькі палёты Ту-154 у ЕС забароненыя з-за неадпаведнасці нарматывам па ўзроўні шуму. З-за гэтага самалёт лётаў адносна мала, і, як сцвярджаюць эксперты, знаходзіцца ў выдатным стане. Тым не менш, у СМІ з'явілася сама меней адно паведамленне пра тэхнічныя непаладкі на борце балгарскага ўрадавага Ту-154: у лютым 2008 года з-за экстранай пасадкі самалёта на Азорскіх выспах быў адменены візіт прэзідэнта Балгарыі ў Мексіку. Палёты балгарскага Ту-154 былі прыпыненыя пасля авіякатастрофы польскага ўрадавага Ту-154 пад Смаленскам, у якой загінуў прэзідэнт Польшчы Лех Качыньскі.

### МЗС РФ ЗАЯВІЛА ПРА ПРЫПЫНЕННЕ ЎСЫНАЎЛЕННЯ АМЕРЫКАНЦАМІ РАСІЙСКІХ ДЗЯЦЕЙ

**У РФ прыпынена ўсынаўленне расійскіх дзяцей грамадзянамі ЗША. Паводле слоў афіцыйнага прадстаўніка МЗС РФ Андрэя Несцярэнкі, аднаўленне гэтай практыкі стане магчымым толькі пасля падпісання двухбаковай дамовы.**

Паводле статыстыкі, з агульнай колькасці ўсынаўленняў расійскіх дзяцей замежнымі грамадзянамі амаль палова прыпадае на ЗША. Другое і трэцяе месцы па колькасці ўсыноўленых дзяцей займаюць Іспанія і Італія адпаведна.

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.04.2010 г. (для б/н разлікаў)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▼1 долар ЗША | 2 955,00 | 1 чэшская крона | 160,36 |
| ▼1 еўра | 4 017,03 | 1 польскі злоты | 1 040,86 |
| 1 латвійскі лат | 5 667,98 | ▼1 расійскі рубель | 102,14 |
| 1 літоўскі літ | 1 162,63 | 1 украінская грыўня | 373,11 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 28,9310 |
| 10 UAH | 36,3227 |
| 1000 BYR | 9,7707 |
| EUR | 39,4387 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

ISSN 1990 - 763X

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

19 красавіка 2010 г. у 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі прадоўжыць работу чацвёртая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК

ТРАДИЦИИ НАДЕЖНОСТЬ КОМПЕТЕНТНОСТЬ

## ОАО «Белвнешэкономбанк»

Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2010 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2009 г. | 2008 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 4,1 | 72746,9 | 71832,2 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 4,2 | 209565,9 | 62100,7 |
| 4 | Ценные бумаги | 1103 | | 141817,5 | - |
| | для торговли | 11031 | | - | - |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | | - | - |
| | в наличии для продажи | 11033 | 4,3 | 141817,5 | - |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 4,4 | 438292,7 | 251417,2 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 4,5 | 1254978,0 | 1077411,2 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 4,6 | 5871,6 | 3409,0 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 4,7 | 86014,3 | 78842,9 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 4,8 | 17127,7 | 23620,4 |
| **10** | **ИТОГО АКТИВЫ** | **110** | | **2226414,6** | **1568633,6** |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 4,9 | 2406,5 | 5169,2 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 4,10 | 440334,4 | 290982,7 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 4,11 | 985298,9 | 811763,4 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | | 7517,6 | 1305,7 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 4,12 | 42435,5 | 24594,6 |
| **17** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **1477992,9** | **1133815,6** |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 4,13 | 605017,0 | 327483,0 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | | 30584,0 | 16255,7 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 4,14 | 54685,8 | 36664,2 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 4,15 | 58134,9 | 54415,1 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | | 748421,7 | 434818,0 |
| **25** | **ИТОГО обязательства и капитал** | **12** | | **2226414,6** | **1568633,6** |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 4,16 | 828713,8 | 501253,3 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 4,17 | 665806,4 | 394712,0 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 2009 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2009 год | 2008 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 5,1 | 191200,3 | 116152,4 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 5,2 | 93288,4 | 59508,2 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 97911,9 | 56644,2 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 5,3 | 66550,1 | 50750,4 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 5,4 | 7230,9 | 6953,5 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 59319,2 | 43796,9 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | | 28713,1 | 16402,0 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 5,6 | 18,3 | 114,3 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | | 1446,7 | 107,1 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 5,7 | 28782,4 | 12623,0 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 5,8 | 19968,3 | 13752,1 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 5,9 | 104185,7 | 81164,2 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 5,10 | 24665,8 | 12967,4 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | | 17393,7 | 8650,5 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 32349,9 | 15411,5 |
| | Базовая прибыль на простую акцию (в рублях) | | | 9,23 | 10,24 |
| | Разводненная прибыль на простую акцию | | | - | - |

### ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2009 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Уставный фонд | Эмиссионный доход | Резервный фонд | Накопленная прибыль (убыток) | Фонды переоценки статей баланса | Всего капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 2 | Остаток на 1 января 2008 года | 3011 | 24122,1 | - | 13173,2 | 29534,3 | 43604,8 | 110434,4 |
| 3 | Изменения статей капитала | 3012 | 303360,9 | - | 3082,5 | 7129,9 | 10810,3 | 324383,6 |
| | В том числе: | | | | | | | |
| 2.1 | совокупный доход | 30121 | X | X | X | 15411,5 | 10810,3** | 26221,8 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | X | 3082,3 | -3082,3 | X | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | 303360,9 | - | X | -5199,3 | X | 298161,6 |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 303325,1 | - | X | X | X | 303325,1 |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | X | X | X | -5199,3 | X | -5199,3 |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | 35,8 | X | X | X | X | 35,8 |
| 2.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | - | - | - |
| 2.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | 0,2* | - | - | 0,2 |
| 3 | Остаток на 1 января 2009 года | 3013 | 327483,0 | - | 16255,7 | 36664,2 | 54415,1 | 434818,0 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2009 года | 3011 | 327483,0 | - | 16255,7 | 36664,2 | 54415,1 | 434818,0 |
| 5 | Изменения статей капитала | 3012 | 277534,0 | - | 14328,3 | 18021,6 | 3719,8 | 313603,7 |
| | В том числе: | | | | | | | |
| 5.1 | совокупный доход | 30121 | X | X | X | 32349,9 | 3719,8*** | 36069,7 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | X | 14328,4 | -14328,4 | X | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | 277534,0 | - | X | - | X | 277534,0 |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 277534,0 | - | X | X | X | 277534,0 |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | X | X | X | - | X | - |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | X | X | X | X | - |
| 5.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | - | - | - |
| 5.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | -0,1* | 0,1* | | - |
| 6 | Остаток на 1 января 2010 года | 3013 | 605017,0 | - | 30584,0 | 54685,8 | 58134,9 | 748421,7 |

** округление*
*** +10811,3 – переоценка 2008 г.; -0,9 – сторно переоценки 2006–2007 гг.; -0,1 – округление*
**** +3715,6 – переоценка за 2009 г.; 4,1 – сторно переоценки за 2008 год; +0,1 – округление*

### СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за 2009 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2009 год | 2008 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль за отчетный период | 301211 | | 32349,9 | 15411,5 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода за отчетный период | 301212 | | 3719,8 | 10810,3 |
| 2.1 | В том числе: переоценка основных средств | 3012121 | | 3687,6 | 10774,7 |
| 2.2 | переоценка незавершенного строительства и неустановленного оборудования | 3012122 | | 32,2 | 35,6 |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | | |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | | |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | | |
| 3 | ИТОГО совокупный доход за отчетный период | 30121 | | 36069,7 | 26221,8 |

### ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2009 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2009 г. | 2008 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 7010 | | 191 164,8 | 115 701,8 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 7011 | | -92 130,9 | -58 363,9 |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 7012 | | 66 550,7 | 50 752,1 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 7013 | | -7 260,9 | -7 048,8 |
| 6 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 7014 | | 26 152,7 | 10 850,2 |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 7015 | | 18,3 | 114,3 |
| 8 | Доход в форме дивидендов | 7016 | | 120,4 | 107,1 |
| 9 | Прочие полученные доходы | 7017 | | 3 633,2 | 13 465,1 |
| 10 | Прочие уплаченные расходы | 7018 | | -111 372,8 | -88 044,9 |
| 11 | Уплаченный налог на прибыль | 7019 | | -17 898,5 | -9 429,4 |
| **12** | **Итого денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах** | **701** | | **58 977,0** | **28 103,6** |
| 13 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 7020 | | 5 192,6 | 10 404,2 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 7021 | | -137 568,0 | 15 159,5 |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов и других денежных средств в банках | 7022 | | -16 807,5 | -69 986,9 |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 7023 | | 4 707,5 | -467 228,5 |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 7025 | | 19 862,2 | -24 965,6 |
| **18** | **Итого потоки денежных средств от изменения операционных активов** | **702** | | **-124 613,2** | **-536 617,3** |
| 19 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 7030 | | -6 174,5 | -2 797,7 |
| 20 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в форме кредитов и других средств банков | 7032 | | 63 558,0 | 157 628,6 |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 7033 | | 21 519,6 | 103 186,8 |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 7034 | | 5 829,1 | 98,0 |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 7035 | | -14 058,1 | 8 191,3 |
| **24** | **Итого потоки денежных средств от изменения операционных обязательств** | **703** | | **70 674,1** | **266 307,0** |
| **25** | **Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности** | **70** | | **5 037,9** | **-242 206,7** |
| 26 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 27 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 7110 | | -23 947,2 | -41 535,7 |
| 28 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 7111 | | 15 266,4 | 30 445,9 |
| 29 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 7112 | | -1 136,3 | -27,8 |
| 30 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 7113 | | 0,0 | 1 570,1 |
| 31 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 7114 | | -6 537,8 | -452 951,1 |
| 32 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 7115 | | 6 537,8 | 452 951,1 |
| **33** | **Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности** | **71** | | **-9 817,1** | **-9 547,5** |
| 34 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 35 | Эмиссия акций | 7211 | | 277 534,0 | 303 325,1 |
| 36 | Выкуп собственных акций | 7212 | | 0,0 | 0,0 |
| 37 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 7213 | | 0,0 | 35,8 |
| 38 | Выплата дивидендов | 7214 | | -11,4 | -5 203,0 |
| **39** | **Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности** | **72** | | **277 522,6** | **298 157,9** |
| **40** | **Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты** | **73** | | **50 207,2** | **944,1** |
| **41** | **Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов** | **74** | | **322 950,6** | **47 347,8** |
| **42** | **Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода** | **740** | **1** | **X** | **201 277,6** |
| **43** | **Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода** | **741** | **1** | **524 228,2** | **X** |

**Председатель Правления** **Г.А. Егоров**

**Главный бухгалтер** **З.С. Кушнерова**

**Дата подписания 03 февраля 2010 года**

*Достоверность бухгалтерского баланса, отчета о прибыли и убытках, отчета об изменении капитала, отчета о движении денежных средств подтверждена.*

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 6 от 27.10.2006. УНП 100010078.

**ИООО «Эрнст энд Янг»**
Республика Беларусь, 220004, Минск
ул. Короля, 51, 2 этаж, офис 30

Тел.: +375(17)209 4535
Факс: +375 (17) 209 4534

### Аудиторское заключение независимой Аудиторской организации ИООО «Эрнст энд Янг» по годовой публикуемой финансовой отчетности ОАО «Белвнешэкономбанк», подготовленной по итогам деятельности за 2009 год

Акционерам и Наблюдательному совету ОАО «Белвнешэкономбанк»

Мы провели аудит бухгалтерского баланса ОАО «Белвнешэкономбанк» (далее «Банк») на 1 января 2010 года, соответствующих отчетов о прибыли и убытках, об изменении капитала и о движении денежных средств за год по указанную дату (далее «отчетные формы»). Данные отчетные формы составлены на основании годового отчета Банка с целью их обязательной публикации. Годовой отчет был подготовлен руководством Банка в соответствии с Законом Республики Беларусь от 18 октября 1994 года № 3321-XII «О бухгалтерском учете и отчетности», «Инструкцией по ведению бухгалтерского учета в банках, расположенных на территории Республики Беларусь», утвержденной постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 19 сентября 2005 года № 283 с изменениями и дополнениями, «Инструкцией по составлению годового отчета банками Республики Беларусь», утвержденной постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 27 ноября 2006 года № 323 с изменениями и дополнениями, и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде.

*Ответственность руководства*

Ответственность за подготовку и представление годового отчета и прилагаемых отчетных форм в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности несет руководство Банка. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверного годового отчета и прилагаемых отчетных форм, не содержащих существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики; определение обоснованных оценочных значений.

*Ответственность Аудиторской организации и описание аудита*

Наша обязанность заключается в том, чтобы на основе проведенного аудита выразить мнение о достоверности данных отчетных форм.

Отчетные формы Банка за 2008 год были проверены другой аудиторской организацией, аудиторское заключение которой датировано 17 марта 2009 года и содержит безусловно положительное мнение об отчетных формах за 2008 год.

Мы руководствовались требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» от 8 ноября 1994 года № 3373-XII и провели аудит в соответствии с Правилами аудиторской деятельности, утвержденными Министерством финансов Республики Беларусь. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность в отсутствии существенного искажения в прилагаемых отчетных формах.

Аудит включает выполнение процедур, направленных на получение аудиторских доказательств в отношении сумм и информации, представленных в отчетных формах. Выбор процедур основывается на суждении аудитора, включая оценку риска существенного искажения отчетных форм вследствие ошибок или недобросовестных действий. При оценке этого риска аудитор рассматривает аспекты внутреннего контроля в отношении подготовки и достоверного представления отчетных форм с тем, чтобы определить процедуры аудита, необходимые в конкретных обстоятельствах, а не для выражения мнения об эффективности системы внутреннего контроля Банка. Аудит также включает оценку уместности выбранной учетной политики и обоснованности бухгалтерских оценок, сделанных руководством Банка, и оценку представления отчетных форм в целом.

Мы считаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими для выражения нашего мнения.

*Мнение*

По нашему мнению, прилагаемые отчетные формы, составленные на основании годового отчета Банка, достоверно, во всех существенных отношениях, отражают финансовое положение Банка по состоянию на 1 января 2010 года, результаты его финансово-хозяйственной деятельности и движение денежных средств за год по указанную дату в соответствии с Законом Республики Беларусь от 18 октября 1994 года № 3321-XII «О бухгалтерском учете и отчетности», «Инструкцией по ведению бухгалтерского учета в банках, расположенных на территории Республики Беларусь», утвержденной постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 19 сентября 2005 года № 283, «Инструкцией по составлению годового отчета банками Республики Беларусь», утвержденной постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 27 ноября 2006 года № 323 с изменениями и дополнениями, и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде.

*Поясняющий параграф*

Прилагаемые отчетные формы не имеют своей целью представление финансового положения и результатов деятельности в соответствии с принципами или методами бухгалтерского учета, общепринятыми в странах, помимо Республики Беларусь. Соответственно, прилагаемые отчетные формы не предназначены для лиц, не знакомых с принципами, процедурами и методами бухгалтерского учета, принятыми в Республике Беларусь.

Мы проводили аудит соответствия годового отчета и прилагаемых отчетных форм требованиям Национальных стандартов финансовой отчетности только в части положений, регламентирующих представление и раскрытие информации в финансовой отчетности.

| | |
|---|---|
| Иностранное общество с ограниченной ответственностью «Эрнст эндЯнг» | Свидетельство о государственной регистрации № 577 от 7 апреля 2005 года. Лицензия на право осуществления аудиторской деятедьности № 02200/0416677 (общий аудит) выдана Министерством финансов Республики Беларусь на основании решения от 25 июля 2005 года № 222 сроком на 5 лет. Внесены изменения и (или) дополнения на основании решения от 8 февраля 2008 года № 37. Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 11 от 15 сентября 2005 года, действительна до 14 сентября 2010 года. |
| Лащенко Павел Анатольевич Директор | Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0000738 от 14 мая 2003 года, без ограничения срока действия. Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям для осуществления аудиторской деятельности в банковской системе № 8 от 28 октября 2004 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования 14 ноября 2008 года). |
| Житомирская Оксана Геннадьевна Заместитель директора по работе с клиентами | Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0001790 от 6 июля 2007 года, без ограничения срока действия. Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям для осуществления аудиторской деятельности в банковской системе № 35 от 12 сентября 2007 года, без ограничения срока действия. |

Дата аудиторского заключения: 19 марта 2010 года.
Место выдачи аудиторского заключения: г. Минск, Республика Беларусь.
Дата получения аудиторского заключения аудируемым лицом: 19 марта 2010 года.

Председатель Правления ОАО «Белвнешэкономбанк» Егоров Г.А.

Директор ИООО «Эрнст энд Янг» Лащенко П.А.

## «Прамая лінія» Старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь Зянона Ломаця

**19 красавіка 2010 г. з 13.00 да 16.00 адбудзецца «прамая лінія» Старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Зянона Кузьміча Ломаця з жыхарамі г. Мінска і Мінскай вобласці.**

Падчас «прамой лініі» можна задаць пытанні пра найбольш надзённыя праблемы рэгіёна, выказаць пра працу службовых асобаў, дзейнасць кантралюючых і наглядных органаў ва ўмовах дзеяння Указа № 510 кіраўніка дзяржавы, які рэгламентуе ажыццяўленне кантролю.

Зянон Ломаць чакае ад вас прапановы, накіраваныя на выяўленне адмоўных тэндэнцый у эканоміцы, пошук рэзерваў для сацыяльна-эканамічнага развіцця Мінскай вобласці і краіны ў цэлым, павышэнне ўзроўню жыцця грамадзян. Пад пільнай увагай Камітэта дзяржкантролю — дзейнасць прадпрыемстваў і арганізацый па разгрузцы складскіх запасаў і рэалізацыі айчыннай прадукцыі. Вы можаце выказаць свае ідэі наконт прасоўвання беларускіх тавараў у краіне і за мяжой.

Сёння Камітэт дзяржкантролю адказвае за эканамічную бяспеку краіны. Для галоўнага кантрольнага ведамства аднолькава важныя як інтарэсы дзяржавы, так і праблемы простага чалавека. Таму кожны факт парушэнняў стане прадметам старраннага разгляду, а слушныя прапановы паслужаць асновай для аналізу.

**Звярнуцца да Зянона Кузьміча Ломаця і задаць сваё пытанне падчас «прамой лініі» можна па тэлефоне 8 017 210 01 65.**

## ЯК ПАДТРЫМАЦЬ ЛЮДЗЕЙ?

**Светлагорск, Рэчыца, Буда-Кашалёва і Рагачоў. Ад жыхароў менавіта гэтых населеных пунктаў Гомельшчыны паступіла больш за ўсё званкоў на «гарачую лінію», якую ў Гомелі правёў старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі Зянон Ломаць. На працягу трох гадзін кіраўнік КДК пагаварыў амаль што з 50 абанентамі. Усяго было прынята 76 званкоў, а колькасць зарэгістраваных спробаў дазвону перавысіла 26,7 тысячы.**

Падводзячы вынікі работы прамой лініі на Гомельшчыне, Зянон Ломаць адзначыў, што падчас тэлефонных стасункаў жыхары вобласці часцей за ўсё ўзнімалі пытанні жыллёва-камунальнага абслугоўвання, добраўпарадкавання населеных пунктаў і ўтрымання дарог. Напрыклад, з некалькіх вёсак Гомельскага і Буда-Кашалёўскага раёнаў скардзіліся, што па іх вуліцах не можа праехаць ніякі транспарт, у тым ліку і «хуткая дапамога». Па словах Зянона Ломаця, ён упершыню даведаўся і пра факт, калі вяскоўцаў прымушалі плаціць грошы за тое, каб расчысціць вуліцу для развароту школьнага аўтобуса. Старшыня КДК перакананы, што гэта прамыя недапрацоўкі мясцовых улад і арганізацый, якія абслугоўваюць гэтыя дарогі.

— Такія адносіны да праблем людзей недапушчальныя, — падкрэсліў Зянон Ломаць. — Пытанні якасці будаўніцтва тыповыя для ўсіх рэгіёнаў вобласці. Нягледзячы на тое, што будаўнікам павысілі заробак амаль у два разы. Што тычыцца якасці — тут прагрэсія не тая, што чакалі. Асаблівага паляпшэння якасці будаўнічых работ не бачна. Пра гэта сведчаць і звароты грамадзян са Светлагорска, Рэчыцы. КДК у гэтым напрамку і надалей будзе праводзіць праверкі. Мы дойдзем да кожнага ЖБК, да кожнага дома, да кожнай кватэры. Кіраўнікі будаўнічых арганізацый няхай выпраўляюць свае памылкі адразу ж — інакш ім не пазбегнуць вялікіх непрыемнасцяў. Асабліва хацеў бы звярнуць увагу на жыллёва-будаўнічыя кааператывы. Людзі ж па капейцы збіраюць грошы гадамі, бяруць крэдыты, а атрымліваюць жыллё, у якім жыць немагчыма.

Значная колькасць тэлефанаванняў была ад вяскоўцаў:

— Зямля, на якой размешчаны сядзібы вяскоўцаў, належыць мясцовым сельскім Саветам. Не кіраўнік мясцовай гаспадаркі ёю распараджаецца, а мясцовыя органы ўлады. Таму старшыня выканкама сваёй галоўнай задачай павінен бачыць падтрымку падворкаў, падтрымку сталых людзей, якім за 80, а яны яшчэ і кароўку трымаюць. Кароўка для іх — гэта жыццё. І яны малако прадаюць дзяржаве. Такіх людзей трэба падтрымліваць. А кіраўнікі, замест таго, каб вырашаць гэтую задачу на дзяржаўным узроўні, пачынаюць палкі ў колы ставіць.

На ўмяшальніцтва старшыні Камітэта дзяржкантролю разлічваюць і прадпрымальнікі, якія працуюць на тэрыторыі санаторыя «Прыдняпроўскі» Рагачоўскага раёна. Па рашэнні адміністрацыі штомесячная плата за гандлёвае месца, якое займае палатка, тут перавысіла мільён рублёў. А кіраўнік фермерскай гаспадаркі з Буда-Кашалёўскага раёна ўзняў пытанне аб уключэнні фермераў у дзяржзаказ на вытворчасць збожжа. Зянон Ломаць даў даручэнне тэрмінова разабрацца ў гэтай сітуацыі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ПРАГАЛАСАВАЦЬ ЦЯПЕР МОЖНА І З ПЕНСІЙНЫМ ПАСВЕДЧАННЕМ

Пашпарт больш не будзе адзіным дакументам, які пацвярджае асобу грамадзяніна, пры галасаванні. Дакументамі, якія дадуць права галасавання на бліжэйшых выбарах у мясцовыя саветы дэпутатаў, стануць **ваенны білет для ваеннаслужачых тэрміновай службы; службовае пасведчанне дзяржслужачага; пенсійнае пасведчанне; студэнцкі білет; даведка органаў унутраных спраў для грамадзян, якія згубілі пашпарт; від на жыхарства для жыхароў Расійскай Федэрацыі, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Беларусі.** Адна з галоўных умоў — наяўнасць у такіх дакументах фотаздымка. Адпаведная пастанова днямі была прынятая на чарговым пасяджэнні Цэнтрвыбаркама.

— Гэтыя ўмовы распаўсюджваюцца на канкрэтную выбарчую кампанію, — зазначыла **старшыня Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА.** — Яны часовага дзеяння і датычацца толькі выбараў ў мясцовыя саветы дэпутатаў, якія адбудуцца 25 красавіка.

## СТАТУС МІЖНАРОДНЫХ НАЗІРАЛЬНІКАЎ АТРЫМАЮЦЬ ДЫПЛАМАТЫ

Паводле слоў старшыні Цэнтрвыбаркама Лідзіі Ярмошынай, Міністэрства замежных спраў Беларусі распаўсюдзіла адпаведную ноту сярод пасольстваў, якая і стала адмысловым запрашэннем для тых дыпламатаў, якія пастаянна пражываюць у Беларусі і хочуць назіраць за выбарамі. На акрэдытацыю дыпламатаў у якасці назіральнікаў ужо паступіла 24 заяўкі ад пасольстваў ЗША, Швецыі, Канады, Літвы, Славакіі, Польшчы, Кітая, Вялікабрытаніі і іншых краін. Акрэдытацыя пройдзе з 19 па 30 красавіка.

— Такая практыка паўтараецца ў нас ужо трэція выбары. Гэта паказчык адкрытасці нашай краіны для дыпламатычных місій, якія працуюць у Беларусі, — адзначыла Лідзія Ярмошына.

Датэрмінова можна будзе прагаласаваць ужо 20 красавіка.

**Ілья ЛАПАТО.**

## Абзац

◢ Паркі Мінска адкрываюць сезон 17 красавіка. У гэты дзень свой 205-гадовы сезон адкрывае Цэнтральны дзіцячы парк імя М.Горкага. Яго наведвальнікаў чакае сюрпрыз: пачнуць працаваць два новыя атракцыёны — «Піражок» і «Аўтадром». Запрашае ў госці і Парк культуры і адпачынку імя Чалюскінцаў. Пачне работу па суботах і нядзелях танцавальная веранда з традыцыйнымі праграмамі для людзей сталага ўзросту і моладзі. На балансе УП «Гарадскія паркі Мінскзеленбуда» знаходзяцца чатыры сталічныя паркі — Горкага, Чалюскінцаў, 50-годдзя Кастрычніка і 900-годдзя Мінска.

◢ **Адзін чалавек загінуў і адзін знаходзіцца ў рэанімацыі ў выніку крушэння дэльтаплана ў Пружанскім раёне. Крушэнне матадэльтаплана адбылося каля 11.00 паблізу вёскі Вялікія Яковічы падчас вучэбна-трэніровачнага палёту. Апарат належаў ТАА «Пружанскі авіяхімсэрвіс». Пры пасадцы лятальны апарат раптоўна ўпаў з вышыні прыкладна 80—100 м ад зямлі. Вядзецца праверка.**

◢ Расце колькасць няшчасных выпадкаў, звязаных са спальваннем сухой травы і смецця. Два з іх адбыліся ў Крупскім раёне. У в. Касенічы пры спальванні смецця на прысядзібным участку гаспадар-пенсіянер атрымаў апёкі 30 % цела. У в. Выдрэса мужчына атрымаў апёкі 60 % цела, спальваючы сухую траву. Абодва яны знаходзяцца ў рэанімацыі. У в. Дубовае ў Докшыцкім раёне пажылая жанчына апякла твар пры спробе патушыць пажар у хляве. Апошні загарэўся, калі гаспадыня выпальвала траву.

◢ **Ва Украіне прадметы раскошы будуць абкладацца дадатковымі падаткамі. З ініцыятывай прыняцця адпаведнага законапраекта выступіў кіраўнік урадавага камітэта па пытаннях эканамічнай палітыкі, віцэ-прэм'ер-міністр Сяргей Цігіпка. Перш за ўсё размова ідзе пра выплату дадатковых падаткаў пры пакупцы ўкраінскімі грамадзянамі самалётаў, верталётаў, яхтаў, дарагіх аўтамабіляў, элітнай нерухомасці і іншых прадметаў раскошы.**

## Поўны абзац

◢ Упершыню ў свеце выйшаў порначасопіс для сляпых. Кніга канадкі Лізы Мэрфі ўтрымлівае не толькі тактыльны тэкст, але і аб'ёмныя малюнкі аголенай натуры. У кнізе 17 ілюстрацый, сярод якіх — «ідэальныя грудзі», «робат кахання» і г.д. Кошт выдання складае каля 230 долараў. «Сляпыя адкінутыя на ўзбочыну культуры, насычанай сэксуальнасцю», — лічыць аўтар. «150 фунтаў? Яны пазбавіліся зроку, але не мазгоў», — скептычна пракаментаваў выхад часопіса чытач таблоіда The Sun, які надрукаваў навіну.

◢ **Злачынец «выбіў» праз суд кампенсацыю ў 4,7 млн фунтаў стэрлінгаў. У 1997 г. Раян Сент-Джордж быў асуджаны на 4 месяцы турмы за крадзеж. Падчас знаходжання ў турме ён зваліўся з нараў і атрымаў сур'ёзную траўму галавы. Суд усклаў віну за інцыдэнт на міністэрства ўнутраных спраў краіны. Акрамя таго, медыцынская дапамога была аказаная пацярпеламу несвоечасова. Цяпер дзяржава павінна не толькі выплаціць пацярпеламу кампенсацыю, але і забяспечыць яму пажыццёвы догляд.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «ПРЫНІЖАЦЬ БЕЛАРУСЬ НІКОМУ НЕ ДАЗВОЛЕНА»

***(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 15 красавіка.)***

Асаблівыя поспехі ў асваенні новых тэхналогій вырошчвання кукурузы на зерне і сілас дэманструе передавая гаспадарка Мазырскага раёна — саўгас-камбінат «Зара», які наведаў кіраўнік дзяржавы.

Тут дабіліся небывалай для Беларусі ўраджайнасці. Жывёлагадоўчыя гаспадаркі «Зары» не купляюць канцэнтраваныя кармы збоку — гэтыя патрэбнасці забяспечвае сілас, які атрымліваецца са сваёй жа кукурузы. Рэнтабельнасць вытворчасці кукурузы на зерне на камбінаце не апускаецца ніжэй за 30 працэнтаў.

«Чаму нельга паўтарыць той вопыт, які ёсць у «Зары»?.. Трэба жорстка патрабаваць за тэхналогію. А то атрымліваецца, што мы страчваем вялікія грошы: укладаем іх, але не атрымліваем належнай аддачы з-за недагляду мясцовых кіраўнікоў», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама даручыў Мінсельгасхарчу пры справаздачах сельгаспрадпрыемстваў улічваць кукурузу як збожжавую культуру. Такім чынам, аграрыі будуць імкнуцца павысіць паказчыкі па збожжавых за кошт кукурузы, што пойдзе толькі на карысць.

«У свой час шмат крытыкавалі Мікіту Хрушчова за яго ініцыятывы па развядзенні кукурузы. Але аказваецца, што задумка была правільная, але тут важна выкананне тэхналогіі», — адзначыў Прэзідэнт.

Таксама падчас гутаркі з губернатарам Гомельскай вобласці Аляксандр Лукашэнка зноў закрануў тэму меліярацыі Палесся. Кіраўнік дзяржавы выказаў ідэю стварэння на месцах раённых атрадаў па рэкультывацыі і расчыстцы зямель у пойме Прыпяці. «За лета яны б убралі хмызняк, зрабілі рэкультывацыю без меліярацыі. Гэта дасць магчымасць нам потым, пры капітальнай меліярацыі, затрачваць меншыя сродкі, бо зараснікі растуць на вачах, і чым далей мы адкладваем — тым цяжэй нам потым будзе», — растлумачыў Прэзідэнт. Ён даручыў кіраўніку Мінсельгасхарча ў бліжэйшыя тыдні сфармуляваць канкрэтныя прапановы па стратэгіі ачысткі пойменных зямель ад хмызняковых зараснікаў. «Рабіць гэта трэба хутка і разумна. Людзям заплаціць як належыць. Гэта акупіцца», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Акрамя пытанняў аграрнага развіцця была закранута важная для грамадства тэма — падрыхтоўка да святкавання 65-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Аляксандр Лукашэнка пабываў на месцы баёў у ходзе Калінкавіцка-Мазырскай наступальнай аперацыі зімы 1944 года. Тут, на беразе Прыпяці, кіраўнік дзяржавы нефармальна пагутарыў з прадстаўнікамі мазырскай раённай ветэранскай арганізацыі.

«Ні адзін ветэран Вялікай Айчыннай вайны не павінен быць пакрыўджаны і пакінуты на волю лёсу, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Калі раптам вы бачыце, што нехта пакрыўджаны, абдзелены падтрымкай — падкажыце, мы гэта выправім. Ветэраны — гэта наш залаты фонд, крэмень, апора дзяржавы».

Потым Прэзідэнт адказаў на пытанні журналістаў.

Прэзідэнт па просьбе журналістаў пракаментаваў рашэнне адміністрацыі ЗША правесці сусветны саміт па ядзернай бяспецы без удзелу Беларусі, хоць наша краіна была першай дзяржавай, якая добраахвотна адмовілася ад ядзернай зброі.

«Гэты факт сведчыць пра тое, што ні амерыканцам, ні ў цэлым Захаду давяраць нельга», — лічыць Прэзідэнт. «У Расіі нас заўсёды чулі і разумелі. І калі б не гэта вакханалія, блытаніна, зразумела на чым заснаваная... Тут, дарэчы, яшчэ прысутнічае рэўнасць, што мы нядрэнна разбіраемся ў сваёй краіне, і многае іншае. Але гэта неразумна. І мы, і яны ўжо гэта разумеем. Але заўсёды расіяне нас разумелі і падтрымлівалі. З Захадам і ЗША гэтага ніколі не было. Яны вось ухапіліся за нейкае пытанне, дабіліся свайго, а таму кінулі і забылі», — адзначыў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, так было і з ядзернай зброяй. «Лічу, што вывад з Беларусі ядзернай зброі на тых умовах, як гэта было ажыццёўлена ў свой час нашымі нацыяналістамі, было жорсткай памылкай», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Мне давялося падпісваць гэты дагавор, таму што дзявацца было няма куды: на мяне націскалі і Расія, і амерыканцы — выводзьце, таму што паабяцалі. Нельга было, гэта найвялікшы здабытак, гэта дарагі тавар, які мы ў рэшце рэшт павінны былі добра прадаць», — сказаў ён.

Прэзідэнт нагадаў, што Беларусь вывела ядзерную зброю пад гарантыі бяспекі з боку вядучых ядзерных дзяржаў. «Нам абяцалі «парасон» бяспекі з боку ядзерных дзяржаў. Гэтага няма!.. Калі б у нас была гэта зброя, з намі б цяпер інакш размаўлялі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Добра, вывелі. Дык гарантуйце ж нам абяцаную бяспеку. Не».

Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ў Беларусі застаўся высокаабагачаны ўран — сотні кілаграмаў, ёсць і ўран нізкай ступені абагачэння. «Мне ўжо які год запар кажуць: вывозьце гэты ўран. Хочаце — у Амерыку, мы вам заплацім, хочаце — у Расію. Я кажу: па-першае, чаму вы нам дыктуеце, калі гэта наш тавар, мы яго трымаем пад кантролем МАГАТЭ. Мы не збіраемся рабіць «брудныя» бомбы або каму-небудзь прадаваць. Мы выкарыстоўваем гэты ўран у даследчых мэтах», — сказаў ён. — Мяне цяпер прыперлі да сцяны, нож да горла — аддай. Я кажу, што ўжо аддалі ў свой час ядзерную зброю, а што мы ад гэтага маем?»

Прэзідэнт падкрэсліў, што дыктаваць умовы нікому не будзе дазволена: «Давайце садзіцца за стол перагавораў і будзем вырашаць, што рабіць з гэтай вялікай колькасцю абагачанага ўрану», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што разумее занепакоенасць іншых дзяржаў, але пры гэтым акцэнтаваў увагу, што Беларусь можа захаваць гэты ядзерны матэрыял, як яна захоўвала яго ўсе гады з моманту набыцця незалежнасці. «Мы на граніцы некалькі разоў затрымлівалі радыеактыўныя рэчывы, дапамагаючы ўсяму свету змагацца супраць гэтага, — нам ніхто дзякуй не сказаў», — адзначыў Прэзідэнт.

«І потым гавораць: калі ты супраць таго, каб аддаць камусьці гэты ўран, — мы цябе не запросім на саміт. Я кажу: дзякуй, я і не збіраўся ехаць. Нават калі б Беларусь запрасілі, я туды не збіраўся ехаць. Чаму, калі Ізраілю было нявыгадна, што зададуць нейкія пытанні па ядзернай зброі, яны памахалі рукой, маўляў, да пабачэння, не патрэбны нам ваш саміт. Прыкладна так і я адказаў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Прыніжаць Беларусь нікому не дазволена, — падкрэсліў ён. — Мы будзем размаўляць толькі салідна, па-партнёрску, як бы на нас ні націскала Амерыка і з другога боку Расія. А тут націск ідзе з двух бакоў, і мы гэта адчуваем».

Кіраўнік дзяржавы таксама дадаў, што Беларусь заўсёды была вельмі надзейным і адказным партнёрам для любой краіны і супольнасці па ўсім, што датычыцца ядзернай бяспекі, і заўсёды выконвала ўсе абавязацельствы. «Трэба больш апасацца, што ў вядучых краінах свету, і ў Расіі, і ў Францыі, і ў Амерыцы былі выпадкі, калі знікалі ядзерныя матэрыялы, і да гэтага часу іх не могуць знайсці. У нас гэтага не было і не будзе, таму што мы сур'ёзныя і адказныя людзі. Мы хабар за гэта не бяром і нікому не збіраемся тайна прадаваць, нават за вялікія грошы, гэты матэрыял», — заявіў Прэзідэнт.

«Ну і, напэўна, там яшчэ ёсць такое стаўленне: вось мы Лукашэнку не запросім на саміт, навошта ўзнімаць яму рэйтынгі напярэдадні выбараў, — сказаў беларускі лідар. — Дык мне сёння дастаткова рэйтынгаў у Беларусі для таго, каб выбрацца Прэзідэнтам, калі ўжо адкрыта казаць. Проста ў наяўнасці бязмозгасць, тупая інерцыя».

Аляксандр Лукашэнка таксама дадаў, што, «калі б Расія, Казахстан і іншыя дзяржавы СНД, якія там прысутнічаюць, былі сапраўды надзейнымі сябрамі Беларусі, яны б жорстка паставілі пытанне: Беларусь — яна наша і яна павінна быць на саміце, і нікуды б амерыканцы тут не дзеліся».

Ён таксама адзначыў, што спакойна перажывае гэту сітуацыю: «Ну, напэўна, не вельмі ўжо патрэбны мы і Расіі. Кожны хоча быць манапалістам у якой-небудзь сферы. Але мы гэта перажывём. Я, напрыклад, спакойна перажываю. Мне больш прыемна з вамі на беразе Прыпяці весці размову, чым сядзець і парыцца ў Вашынгтоне».

Каментуючы нядаўнія падзеі ў Кыргызстане, Аляксандр Лукашэнка заявіў: «Гэта дзяржаўны антыканстытуцыйны пераварот. Не дай Бог, каб такое адбылося ў нас. І іншым дзяржавам я таксама не жадаю чаго-небудзь падобнага. І не трэба праводзіць паралелі з тым, што адбывалася ў час «цюльпанавай рэвалюцыі». Па-першае, тады не перастралялі людзей. А па-другое, Аскар Акаеў тады адмовіўся ад пасады. Цяперашні Прэзідэнт ад пасады не адмаўляўся. І не дай Бог кыргызскім апазіцыянерам пасадзіць або, горш, застрэліць Бакіева. Гэта выйдзе бокам».

«Што датычыцца пытання, хто за гэтым стаіць, то, каб адказаць на яго, трэба дакладна ведаць адказ. У мяне няма пакуль такой дакладнай інфармацыі, але яна з часам выплыве», — упэўнены Прэзідэнт Беларусі.

«Уявіце, што гэта здарылася б у Беларусі. Але толькі, вядома, не з Лукашэнкам (калі б Лукашэнку звергглі, то акрамя беларускага народа, большай яго часткі, ніхто б не пакутаваў — усе б апладзіравалі), а калі б звергглі беларускага апазіцыянера, які прыйшоў да ўлады... Што б тады пачалося! Вылі б, крычалі, нылі: неканстытуцыйна, дыктатура і гэтак далей. А сёння ўсе маўчаць: ЗША маўчаць, а Расія, вы ведаеце, якія зрабіла заявы. Але чамусьці ніхто з іх не сказаў, што гэта антыканстытуцыйны дзяржаўны пераварот», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Пры гэтым ён дадаў: «Я не хачу пакрыўдзіць цяперашнія сілы, якія прыйшлі да ўлады ў Кыргызстане. Але хацеў бы сказаць тым, хто сёння папракае Бакіева ў кланавасці і ў тым, што ён разваліў краіну... Узнікае пытанне: а што, мы ўчора гэтага не бачылі? І я ў гэтым плане абсалютна чысты. Я двойчы меў з Бакіевым прынцыповую размову (у нас былі добрыя адносіны), і я адкрыта сказаў яму: Курманбек, глядзі, каб не наступіць на тыя ж граблі. Але я ведаю аб сынах Бакіева — паверце, жыць з шыкам у такой краіне, як Кыргызстан, проста немагчыма. Гэта бедная краіна. І папракаць Бакіева ў тым, што ён яе раскраў, — проста смех. Ён кідаўся па розных краінах, здабываючы крэдыты. І я ведаю, куды ён іх укладаў: у Кыргызстане будавалася гідраэлектрастанцыя. Расія паабяцала крэдыт, а потым адмовіла. І ён гаварыў мне, што вымушчаны быў пакінуць амерыканцаў (на базе «Манас»), таму што яны хоць плацяць грошы за арэнду».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Я лічу, што палітыка, па-першае, амерыканцаў, а па-другое, расіян адносна гэтых падзей вельмі дрэнная і недальнабачная. Яны павінны былі заявіць аб непрымальнасці такіх дзеянняў кыргызскай апазіцыі».

Прэзідэнт Беларусі таксама сказаў: «Калі б такое адбывалася ў маёй краіне і нехта павёў бы людзей пад кулі — мала б такім не паказалася. І няма чаго папракаць Бакіева за тое, што ўлада прымяняла сілу, абараняючы сябе. Бо калі ўлада не можа абараніць сябе і свой народ, дык што гэта за ўлада?..» На думку Аляксандра Лукашэнкі, тым сілам, якія прыйшлі сёння да ўлады ў Кыргызстане, «трэба яшчэ добра падумаць пра тое, як сябе легітымізаваць».

Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў таксама трагічныя падзеі пад Смаленскам — крушэнне самалёта Прэзідэнта Польшчы.

«Мы вельмі шкадуем. Гэта трагедыя. Загінуў не толькі Прэзідэнт, амаль 100 чалавек, у тым ліку кіраўнікі дружалюбнага, вельмі блізкага нам народа. Вядома, гэта трагедыя не магла не адгукнуцца ў нашых сэрцах», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што беларускі бок аказаў усю неабходную дапамогу тысячам палякаў, якія хацелі выехаць праз Беларусь да месца трагедыі. Для спецыяльных авіярэйсаў бясплатна быў прадастаўлены аэрапорт у Віцебску, аўтамабілі дэлегацыям. «Мы зрабілі ўсё, што трэба было зрабіць у гэтай сітуацыі для нашага суседа», — сказаў ён.

«Не хачу гаварыць, хто вінаваты, хто не, хоць для мяне тут усё абсалютна зразумела. Проста хачу даць інфармацыю. Калі ляціць самалёт з Прэзідэнтам на борце, калі ідзе адхіленне ад нормы, камандзір экіпажа непасрэдна дакладвае Прэзідэнту аб гэтым. Прэзідэнт пытаецца, ці магчыма, як у гэтым выпадку, пасадзіць самалёт, але апошняе слова застаецца за Прэзідэнтам. Ён прымае рашэнне, садзіць самалёт ці не. Але пілоты маюць права не паслухацца», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка расказаў журналістам, што ў Леха Качыньскага аднойчы ўжо была сітуацыя, калі з-за дрэнных умоў надвор'я яго самалёт не зрабіў пасадку ў Грузіі, а прызямліўся ў Азербайджане. «Тады хацелі зняць з пасады пілотаў за тое, што яны не паслухаліся. Міністр абароны тады за іх заступіўся», — сказаў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што ў яго гэта недапушчальна: калі ён прымае рашэнне, пілоты жалезна выконваюць.

Прэзідэнт Беларусі расказаў аб двух выпадках, калі яму давялося прымаць такія рашэнні. Аднойчы гэта было пры вяртанні з Пекіна ў Мінск у дрэнных умовах надвор'я, а другі раз — праводзячы візіт у ахоплены вайной Бялград.

«Гэтак жа было над Смаленскам. Пілот прыйшоў, я ўпэўнены ў гэтым, далажыў Прэзідэнту, тым больш самалёт чатыры разы заходзіў на пасадку, нулявая бачнасць. Прэзідэнт прыняў рашэнне садзіцца», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. Ён таксама адзначыў, што неабходна было мець на ўвазе, што самалёт не меў тых навігацыйных прыбораў, якія ёсць у сучасных авіялайнерах. Акрамя таго, аэрапорт у Смаленску не мае такога абсталявання, якое дазваляла б цалкам аўтаматычна пасадзіць самалёт. «Тады нельга было прымаць такое рашэнне. А яно было прынята, — рэзюмаваў Прэзідэнт. — Зразумела, хто нясе за гэта адказнасць. Вінаваты ці не вінаваты, але ты галоўны на борце чалавек, ты нясеш за гэта адказнасць. І мы, прэзідэнты, павінны памятаць пра тое, што ў самалёце сядзіць яшчэ сотня чалавек, у якіх ёсць сем'і». Ён таксама лічыць, што «гаварыць аб тым, што вінаватыя пілоты, што яны прынялі рашэнне, няправільна, так не бывае».

«Што датычыцца гэтай трагедыі, гэта вельмі сур'ёзны ўрок нам. Вельмі шкада, што Прэзідэнт загінуў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Калі гіне Прэзідэнт, гэта вельмі дрэнна і для краіны, і для прымаючага боку», — дадаў ён.

«Паслухаем, што скажа камісія, але вы ўбачыце, што ўсё было нармальна з тэхнікай. Тут было няправільнае рашэнне галоўнага чалавека на борце», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

# РАНЕЙШЫЯ ПЕНСІЙНЫЯ ПРАВЫ НАСТАЎНІКІ НЕ СТРАЦЯЦЬ

**НА пытанні чытачоў «Звязды» адказваюць наменнік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валянціна Вікенцьеўна КАРАЛЁВА і наменнік начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання міністэрства Ларыса Міхайлаўна ЯШКОВА.**





***(Працяг. Пачатак у нумары за 10 і 15 красавіка.)***

☎ ***— Мая сястра 39 гадоў адпрацавала ў школе тэхнічкай, прычым пяць апошніх з іх — на паўтары стаўкі. Але, нягледзячы на гэта, цяпер яе пенсія — усяго 290 тысяч. Прычым самае дзіўнае: спачатку пенсію разлічвалі з каэфіцыента 0,6, а сёння — ужо з 0,4. Як такое можа быць?***

**Раіса Сцяпанаўна,** *Слонімскі раён*

— На жаль, Раіса Сцяпанаўна, адказаць на гэта пытанне без вывучэння дакументаў немагчыма, таму мы даручым разабрацца ў сітуацыі ўпраўленню па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Слонімскага райвыканкама і даць вам адказ.

☎ ***— Мая маці, Любоў Давыдаўна Жардзецкая, з'яўляецца ўдзельніцай вайны. А праблема ў нас такая: у хаце моцна цячэ дах, а каб адрамантаваць яго — трэба знайсці 6-8 мільёнаў. Мы звярталіся па дапамогу і ў сельсавет, і ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама, але чулі аднолькавы адказ: грошай няма, ды і ўвогуле, займацца рамонтам павінны дзеці. Магчыма, гэта і слушна, вось толькі ўсе трое дзяцей нашай маці — пенсіянеры. Што нам рабіць?***

**Святлана Уладзіміраўна,** *Лагойскі раён*

— Сапраўды, паводле Закона «Аб ветэранах», удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны прадугледжана права на правядзенне рамонту жылых памяшканняў за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў і на ўмовах, якія вызначаюцца зноў жа мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі. Прычым на падставе гэтага палажэння Закона мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, як правіла, дапамагаюць перш-наперш адзінокім інвалідам і ўдзельнікам вайны, а таксама адзінокім пажылым людзям, якія патрапілі ў цяжкую сітуацыю і вырашыць праблемы самастойна не могуць. Адпаведна, рамонты астатнім грамадзянам павінны рабіць дзеці і ўнукі. У прыватнасці, варта нагадаць: паводле артыкула 32 Канстытуцыі «дзеці абавязаныя клапаціцца аб бацьках і асобах, якія іх замяняюць, а таксама аказваць ім дапамогу».

☎ ***— Памёр муж, засталіся два хлопчыкі — 11 і 13 гадоў. Ці можа наша сям'я аформіць пенсію па страце карміцеля? І што для гэтага неабходна?***

**Алена Пятроўна,** *Бярозаўскі раён*

— У выпадку смерці карміцеля права на пенсію па яго страце маюць непрацаздольныя члены сям'і, і ў тым ліку — няпоўнагадовыя дзеці. Прычым для афармлення такой пенсіі неабходна звярнуцца да працадаўца па апошнім месцы працы (калі на дату смерці муж працаваў) або ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства.

☎ ***— Цяпер мне 24 гады, маю II групу інваліднасці. Які павінен быць стаж для пераходу з пенсіі па інваліднасці на працоўную пенсію, і наколькі выгадны такі пераход? І яшчэ: ці лічыцца ў стаж праца на чвэрць стаўкі?***

**Марына НЯФЁДАВА,** *г. Мінск*

— Працягласць стажу, для прызначэння працоўнай пенсіі па інваліднасці залежыць ад узросту, у якім наступіла інваліднасць (напрыклад, ва ўзросце 24 гады неабходны мінімальны працоўны стаж складае 2 гады), а таксама ад заробкаў. Прычым незалежна ад памеру стаўкі ў стаж цалкам залічваецца праца з заробкам, што перавышае мінімальную зарплату. Калі заробак атрымліваўся менш за «мінімалку», то праца залічваецца ў стаж з памяншальным каэфіцыентам. Сацыяльная пенсія інваліду II групы з дзяцінства вызначана ў 75 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму — цяпер памер такой пенсіі складае 191 415 рублёў. У той жа час сёння мінімальны памер працоўнай пенсіі па інваліднасці — гэта 218 980 рублёў. Аднак для вывучэння пытання магчымасці і мэтазгоднасці пераходу на працоўную пенсію па інваліднасці ўсё ж трэба звярнуцца ва ўпраўленне сацыяльнай абароны па месцы жыхарства з адпаведнымі дакументамі аб працы. Калі асоба мае права на некалькі відаў дзяржаўных пенсій адначасова, то можа прызначацца толькі адна з іх.

☎ ***— Афіцыйна мы з мужам знаходзімся ў шлюбе, але фактычна — ужо паўтара года не жывём разам. Ці будуць улічвацца даходы мужа, калі я звярнуся па адрасную сацыяльную дапамогу?***

**Галіна Уладзіміраўна,** *Полацкі раён*

— Поўны даход мужа будзе ўлічвацца ў выпадку, калі вы ведзяце сумесную гаспадарку. А сам факт сумеснага вядзення або невядзення гаспадаркі вызначаецца камісіяй на падставе абследавання матэрыяльна-бытавога становішча.

Аднак у выпадку, калі камісія вызначыць, што сумесную гаспадарку вы не ведзяце, трэба мець на ўвазе адзін нюанс. Калі гаворка ідзе аб сям'і, дзе ёсць няпоўнагадовыя дзеці, паміж бацькамі шлюб зарэгістраваны, але тыя ж бацькі вядуць асобную гаспадарку, то ў сукупны даход маці для прызначэння адраснай сацыяльнай дапамогі ўключаюцца так званыя ўмоўныя аліменты ў наступных памерах: на адно дзіця — 25 працэнтаў, на дваіх дзяцей — 33 працэнты, на траіх і больш дзяцей — 50 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму ў цэнах верасня папярэдняга перад зваротам года.

☎ ***— Мая дачка і мой зяць вучацца ва ўніверсітэце ў Брэсце, абодвум цяпер — па 18 гадоў. Нядаўна дачка нарадзіла дзіця, і маладая сям'я звярнулася ў Брэсцкае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па адрасную дапамогу, але пачула адмову. Нібыта фармальна ўсё правільна: да студзеня гэтага года зяць часта ездзіў ва Украіну, адзін раз ездзіла туды і дачка. Але ёсць адзін нюанс — гэтыя паездкі не мелі ні турыстычных, ні камерцыйных мэтаў. Сутнасць у тым, што маці зяця нарадзілася недалёка ад беларускай мяжы ў суседняй Валынскай вобласці, там жа, на Валыншчыне, у зяця жывуць шматлікія сваякі. Мы прапанавалі прынесці ва ўпраўленне пасведчанне аб нараджэнні маці, але прапанову ніхто па сутнасці не пачуў. І ўсё ж хацелася б ведаць: ці павінны былі маладой сям'і прызначыць адрасную сацыяльную дапамогу?***

**Валянціна Іванаўна ЛАШКЕВІЧ,** *Маларыцкі раён*

— Адна з падстаў для адмовы грамадзяніну або сям'і ў штомесячнай адраснай сацыяльнай дапамозе — здзяйсненне на працягу 12 месяцаў перад зваротам па дзяржаўную падтрымку выязнога турызму. Прычым пад выязным турызмам маецца на ўвазе падарожжа грамадзян за кошт уласных сродкаў за межы Беларусі для адпачынку, з пазнавальнымі і іншымі мэтамі без занятку працоўнай, прадпрымальніцкай і іншай дзейнасцю, якая прыносіць даход. Як падаецца, разабрацца ў сітуацыі з вашым зяцем, павінны ўсё ж у Брэсце — як кажуць, з улікам усіх нюансаў. Але, са свайго боку, можна заўважыць: факт выязнога турызму не з'яўляецца перашкодай для прызначэння аднаразовай адраснай дапамогі, права на якую дае даход на кожнага члена сям'і ў памеры ніжэй за 150 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму.

☎ ***— Патлумачце, ці мае права на бясплатны артапедычны абутак інвалід III групы з парушэннямі апорна-рухальнага апарату? І што трэба рабіць, каб атрымаць такі абутак?***

**Міхаіл Іванавіч САКАЛОЎСКІ,** *г. Мінск*

— Незалежна ад узроўню даходу інвалід III групы (апроч выпадкаў, калі інваліднасць стала вынікам супрацьпраўных дзеянняў, алкагольнага, наркатычнага ці таксічнага ап'янення, а таксама наўмыснага пашкоджання свайго здароўя) можа атрымаць сацыяльную дапамогу на аплату неабходных тэхнічных сродкаў рэабілітацыі. У прыватнасці, такая дапамога для набыцця артапедычнага абутку прадстаўляецца інвалідам III групы ў грашовай безнаяўнай форме — з разліку 1 пара на працягу каляндарнага года. Заяву аб прызначэнні сацыяльнай дапамогі на аплату артапедычнага абутку неабходна падаць ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства. Да гэтай заявы інваліду III групы трэба дадаць дакумент, які сведчыць асобу, пасведчанне інваліда і індывідуальную праграму рэабілітацыі ці медыцынскае заключэнне ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя.

**Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтаваў Сяргей ГРЫБ.**
**Фота аўтара.**

Минский городской центр недвижимости

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (организатор аукциона)**
**17 мая 2010 года повторно проводит открытый аукцион по продаже зданий, сооружений и иного имущества, находящегося в собственности ОАО «Белаттракцион» (продавец)**

**На аукционные торги выставляются:**

| Номер лота | № 1 | № 4 |
|---|---|---|
| Наименование и характеристики имущества, входящего в состав лота | - здание административно-хозяйственное, инв. номер 500/С-48231, площадь 69,6 кв.м;<br>- здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, инв. номер 500/С-48232, площадь – 67,0 кв. м;<br>- ограждение металлическое, протяженность – 470 м;<br>- асфальтобетонное покрытие, площадь – 29,6 кв.м | - здание административное инв. номер 400/С-2446, площадь – 178,7 кв.м. |
| Местонахождение имущества | г. Минск, ул. Ташкентская, д. 25 | г. Гродно, ул. Виленская, д. 20 |
| Сведения о земельном участке | площадь – 0,0090 га, кадастровый номер 500000000002006760; назначение – эксплуатация и обслуживание здания специализированного складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; площадь – 0,0074 га, кадастровый номер 500000000002006759, назначение – эксплуатация и обслуживание административно-хозяйственного здания | площадь – 0,0350 га, кадастровый номер 440100000002003160, назначение – обслуживание административного здания |
| Начальная цена без учета НДС | 57 271 488 белорусских рублей | 65 871 360 белорусских рублей |
| Сумма задатка | 5 500 000 белорусских рублей | 6 500 000 белорусских рублей |

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект (лот). Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона заключается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта (лота) осуществляется в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **17 мая 2010 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с **17.04.2010 по 14.05.2010** включительно в рабочие дни с 09.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**

**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости» (ул. К. Маркса, д. 39, 220030, г. Минск);**

**(017) 222 73 14 – ОАО «Белаттракцион» (ул. Могилевская, д. 68, 220007, г. Минск).**

**Интернет: www.mgcn.by**

## «МЫ НЕ ДЛЯ ТАГО РЫЗЫКАВАЛІ ЖЫЦЦЁМ»

**Ад імя ветэранаў, былых партызанаў і падпольшчыкаў Вялікай Айчыннай вайны Навагрудскага раёна звяртаемся да Вас з просьбай данесці да жыхароў нашай краіны думку наконт правакацыйнай дзейнасці сайта ў інтэрнэце «Белорусский партизан».**

Мы глыбока абураныя тым, што, прыкрываючыся святымі для кожнага беларуса словамі, складальнікі сайта размяшчаюць няправераную і недакладную інфармацыю пра сацыяльна-эканамічнае, палітычнае развіццё нашай краіны.

Нашы землякі, жыхары Навагрудчыны, мужна змагаліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны з ненавісным ворагам у партызанскіх атрадах і антыфашысцкім падполлі. Навагрудчына страціла за гады ваеннага ліхалецця звыш 45 тыс. сваіх жыхароў. Мы, ветэраны, не для таго рызыкавалі сваім жыццём, каб сёння некаторыя «пісакі» аблівалі граззю дзейную ўладу і наш народ.

Змест сайта не адпавядае яго назве і той палітыцы, якую праводзіць наш урад у нашай краіне. Сайт аб'ектыўна наносіць шкоду рэпутацыі нашай дзяржавы і не можа насіць назву «Белорусский партизан».

У сувязі з тым, што набліжаецца гадавіна Вялікай Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі, мы хочам, каб да гэтага юбілею імя беларускіх партызан было ачышчана ад ўсяго, што кампраметуе гэтыя свяшчэнныя для кожнага беларуса і для нас словы.

**Прэзідыум Навагрудскай раённай арганізацыі Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў.**

## ВЫХАВАНЫ КІШЭННІК

**Мужчына прапанаваў пасажырцы тралейбуса сесці на сваё месца, каб... абакрасці.**

На шчасце пацярпелай, уцячы зламыснік не паспеў, бо быў своечасова выкрыты — проста на прыпынку, калі спрабаваў пакінуць салон тралейбуса. А разыграўся «спектакль аднаго акцёра» ў сталічным тралейбусе 16 маршруту. Падчас руху зладзюжка ўпільнаваў ахвяру і ветліва прапанаваў ёй сесці, вызваліўшы месца. Калі ж ён ушчыльную наблізіўся да апошняй, то не губляў дарэмна часу: змог выцягнуць са знешняй кішэні сумачкі партманет, у якім знаходзілася 252 тысячы рублёў, 105 долараў ЗША. 31-гадовы мінчанін быў ужо неаднаразова судзімы за ўчыненне маёмасных злачынстваў. Затрыманаму пагражае да 4 гадоў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
КРАСАВІКА
2010 г.
ПЯТНІЦА
№ 14 (15617)

Школа юнкараў

# МОВА — МОЙ СУСВЕТ

...Дарога да Мінска займае трохі больш за гадзіну. Той раз я пераадольваў яе, едучы ў ліцэй на ўступны экзамен па беларускай мове. Ехаў не адзін, з матуляй. У дарозе, вядома, ужо не да правілаў (не вывучыў раней — не вывучыш і за гадзіну). Аднак, каб настроіцца на беларускую хвалю, мы вырашылі весці гутарку паміж сабой па-беларуску. Я не ўяўляў, што гэта так моцна можа ўразіць жанчыну, якая сядзела насупраць. Яна нават перастала кляваць носам і, сапраўды ўражаная, прыслухоўвалася да нашай гутаркі. Прызнаюся, мне нават спадабалася такая ўвага.

...Мой нямецкі сябар Джэйсан падчас візіту ў Мар'інагорскую гімназію, дзе я вучыўся, наведваў усе запланаваныя мерапрыемствы. І экскурсію па літаратурна-краязнаўчай экспазіцыі ў тым ліку. Экскурсія вялася на беларускай мове. Яе, зразумела, нямецкім школьнікам перакладалі. Аднак Джэйсан потым сказаў, што пачуў некалькі амаль знаёмых слоў. Мы сядзелі ўвечары і адшуквалі падобныя беларускія і нямецкія карані. Аказалася, іх нямала. Тады я адчуў, што не хапае мне трохі слоўнікавага запасу.

...А гэтую гісторыю расказала мне настаўніца, якая вярнулася з падарожжа па Еўропе, куды ездзіла разам з сяброўкай. Святлана Пятроўна па жыцці размаўляе па-беларуску. І за мяжой не збіралася мяняць звычкі. Таму ўражаннямі з сяброўкай дзялілася на роднай мове. І ў гэты момант да іх нечакана звярнуўся іспанец, запытаўшыся, адкуль жанчыны прыехалі. Ён, як высветлілася, ведаў нямала пра Беларусь. Больш за тое, папрасіў на чыстай беларускай мове, каб з ім пагутарылі па-беларуску. Ужо потым высветлілася, што іспанскі прафесар вывучае і выкладае нашу мову ва ўніверсітэце.

Яшчэ год таму я неяк не задумваўся пра тое, што мне на самай справе ніхто не забараняе размаўляць па-беларуску па-за межамі класа, дзе мы спрабуем за гадзіну-другую ў тыдзень авалодаць роднай мовай. А сёння я адчуў патрэбу вучыць мову так, каб яна, як і руская, стала мне абсалютна роднай. Такім чынам, я дакрануўся да тэмы двухмоўя, якую часам актыўна абмяркоўваюць у нашым грамадстве. Двухмоўе (або білінгвізм) існуе там, дзе дзве мовы з'яўляюцца афіцыйнымі, дзяржаўнымі. У нас гэта беларуская і руская мовы. Гістарычна абумоўлена, на жаль, што беларуская мова была абмежавана ў карыстанні, бо доўгі час краіна знаходзілася ў складзе то Рэчы Паспалітай, то Расійскай імперыі. У 1917 годзе ў Беларусі размаўлялі па-беларуску, па-польску, па-руску і на ідыш. Беларусь шматнацыянальная краіна і сёння. І хоць, па некаторых дадзеных, 75 % беларусаў лічаць сёння беларускую мову роднай, аднак часта чуць яе на вуліцах, у транспарце, у крамах не даводзіцца. Некаторыя мае аднагодкі лічаць, што па-беларуску гавораць неадукаваныя людзі з глыбінкі. Я не згодны. Каб добра і ўпэўнена гаварыць на мове Купалы, Багдановіча, трэба, наадварот, быць адукаваным чалавекам, які не будзе рабіць «салянку» з дзвюх моў. Калі я пачынаю гаварыць ці пісаць па-беларуску, я адчуваю сябе сапраўдным беларусам, чалавекам, за якім стаіць краіна, народ. Веданне сваёй роднай мовы дае мне гэтае права — называцца беларусам. Больш за тое, кожнае новае вывучанае слова дае мне таксама пачуццё радасці, упэўненасці, а разам з тым і адказнасці за сваю зямлю. Дзякуючы настаўнікам Мінскага дзяржаўнага абласнога ліцэя, я, здаецца, хутчэй іду па шляху вывучэння роднай мовы. І не толькі я. Нямала маіх сяброў сёння ўпэўнена гавораць па-беларуску, не баючыся стаць у чыіхсьці вачах «белай варонай». Успамінаючы шчырае здзіўленне жанчыны ў электрычцы, хачу сказаць, што сёння я часцей бачу ў вачах людзей не здзіўленне, а павагу. І гэта вельмі прыемна.

...А напрыканцы яшчэ адзін эпізод з жыцця. Мой маленькі сусед толькі пачаў вучыць у школе беларускую мову. Яму нялёгка, бо ён расце ў руска-ўкраінскім асяроддзі. Чуе дома абедзве мовы, але не беларускую. Часам ён прыходзіць да нас з пытаннямі. Адказваем, дапамагаем. І раім больш чытаць па-беларуску. Для гэтага нядаўна падарылі яму прыгожую, толькі-толькі выдадзеную дзіцячую кніжку матулінай сяброўкі, пісьменніцы і журналіста Вольгі Савасцюк «Палахлівы матылёк». Мне самому спадабаліся цудоўныя, добрыя дзіцячыя вершы, змешчаныя ў кнізе для маленькіх. І сусед Максім цяпер з задавальненнем чытае іх штодзень. А ў якасці навагодняга падарунка ён расказаў нам каля ёлкі вялікі верш на беларускай мове. Расказаў прыгожа, выразна і, галоўнае, зусім па-беларуску.

**Кірыл ШАНТЫКА,**
**вучань Мінскага дзяржаўнага абласнога ліцэя.**

Ёсць пытанне

# Як не быць адлічаным з ВНУ?

*Падкажыце, калі ласка, у якім выпадку студэнт можа быць не дапушчаны да здачы экзаменаў падчас экзаменацыйнай сесіі? Колькі спробаў яму даецца, каб пераздаць экзамен і не быць адлічаным? За колькі «хвастоў» студэнта могуць адлічыць з універсітэта? У якім выпадку студэнт павінен аплачваць прапушчаныя кантрольныя і лабараторныя заняткі? Чаму ў адных ВНУ студэнтаў прымушаюць аплачваць не здадзеныя своечасова залікі і пераздачу іспытаў, а ў іншых гэта не робяць? Ці ёсць адзіны для ўсіх ВНУ дакумент (загад Міністэрства адукацыі ці пастанова Урада), дзе былі б прапісаны ўсе нюансы, якія датычацца бягучай атэстацыі студэнтаў і экзаменацыйных сесій?*

**Студэнты БНТУ.**

«Праходжанне студэнтамі ВНУ бягучай атэстацыі рэгулюецца «Палажэннем аб курсавых экзаменах і заліках у вышэйшых навучальных установах», зацверджаным загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 22.08.1994 № 235-А», — патлумачылі нам у галоўным упраўленні вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі, куды мы звярнуліся з пытаннем нашых чытачоў.

**Студэнты вочнай формы навучання дапускаюцца** да экзаменацыйнай сесіі пры ўмове здачы ўсіх залікаў, прадугледжаных вучэбным планам, выканання і здачы ўстаноўленых разлікова-графічных і іншых работ па дысцыплінах вучэбнага плана бягучага семестра. **Студэнт адлічваецца з ВНУ, калі ў сесію ён не здаў іспыты па трох і больш дысцыплінах ці не ліквідаваў ва ўстаноўленыя тэрміны акадэмічную запазычанасць.** Пераздача экзамена па адной і той жа дысцыпліне пры ўмове атрымання студэнтам нездавальняючай адзнакі дапускаецца не больш як два разы. Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 3 кастрычніка 2002 года № 1376 зацверджаны Пералік платных паслуг, што аказваюць дзяржаўныя ўстановы адукацыі, які, у прыватнасці, уключае:

дадатковае (звыш устаноўленых вучэбнымі планамі гадзін) навучанне па асобных вучэбных прадметах, вучэбных дысцыплінах і курсах;

арганізацыю бягучай атэстацыі для асобаў, якія не здалі экзамены, залікі, не прайшлі іншыя формы кантролю вынікаў вучэбнай дзейнасці, прадугледжаныя вучэбнымі планамі і вучэбнымі праграмамі.

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

Рэпарцёр атрымаў заданне...

# ВЫПІЦЬ КУБАЧАК ГАРБАТЫ Ў ЦЭНТРЫ СТАЛІЦЫ



**Як аказалася, гэта не так проста, асабліва ў кавярнях па праспекце. І не тое каб месцаў не хапае ці патрабаванні да іх завышаныя. Справа ў тым, што большая палова персаналу кавярняў не ведае, што такое «гарбата», «кава» і «цукар». А словы «цытрына» ці булкі з «разынкамі» выклікаюць сапраўднае замяшальніцтва...**

Легенда, з якой я выправілася ў кавярні, была наступная. У госці прыехалі сябры з Нямеччыны, вялікія аматары гарбаты. І вось зараз я шукаю месца, куды іх можна было б прывесці. А паколькі яны хочуць пачуць жывую беларускую гутарку, то пажадана абслужыць нас па-беларуску.

## «Неяк па-англійску мы больш»

У кавярні «Залаты грабеньчык» непадалёку ад гасцініцы «Еўропа», што такое «гарбата» не перапытвалі. Аднак пра абслугоўванне па-беларуску адказалі адмоўна.

— Маш, у нас ёсць хто-небудзь, хто па-беларуску размаўляе? — перапытала адміністратарка ў дзяўчыны за барнай стойкай.

— Не-а, у нас неяк па-англійску больш, — адказала тая.

— Вось бачыце, мы не зможам вам нічым дапамагчы, — развяла рукамі адміністратар.

## Гарбата? А што гэта?

У кафэ «Безэ» няспешна піла гарбату пажылая пара, іграла спакойная музыка...

— Добры дзень! Што вам? — падышла да мяне ружавашчокая дзяўчына.

— Раскажыце мне, калі ласка, якая ў вас ёсць гарбата, — кажу ёй я. — Мне патрэбна арыгінальная гарбата, каб не сорамна было перад гасцямі з Нямеччыны.

Дзяўчына, не збянтэжыўшыся, адкрыла меню на старонцы «Торты».

— Прабачце, можа, вы мяне зарыентуеце, дзе тут у вас раздзел з гарбатай, — перагортваючы старонку за старонкай, прашу я.

— А што гэта такое «гарбата»?— нясмела перапытвае мяне афіцыянтка.

Я адказваю, што гарбата — гэта такі гарачы напой. Дзяўчына адкрывае раздзел «Спіртныя напоі» і пачынае пралістваць меню ў пошуках гарбаты.

— Давайце я сама пагляджу, — ледзь стрымліваючыся, каб не засмяяцца, кажу я. — Дык вось жа яна!

Тыцкаю пальцам у раздзел «Чай». Афіцыянтка заліваецца чырванню.

Наконт абслугоўвання па-беларуску тут мне таксама адмовілі.

## Выраз «гарбата з цытрынай» ставіць у тупік

Цэнтр горада. Няміга. Кавярня «Верхні горад», што месціцца недалёка ад кафедральнага сабора. Шыльдачка з назвай па-беларуску, расклад працы таксама. Антураж сярэднявечча і беларускай даўніны. Ну, думаю, тут дакладна павінны разумець беларускую мову.

— Добры дзень. Скажыце, ці ёсць у вас гарбата з цытрынай? — адразу звяртаюся да афіцыянта. Малады хлопец гадоў 23 збянтэжана ўсміхаючыся, стаіць моўчкі.

Паўтараю пытанне, ён чырванее яшчэ больш. Перапытваю ўжо па-руску.

— А-а-а... Вядома, ёсць, мы можам вам зрабіць, што пажадаеце.

— Скажыце, а калі мы з сябрамі-замежнікамі прыйдзем да вас, вы зможаце нас абслугоўваць па-беларуску? А то яны прыехалі з Нямеччыны і амаль не чулі жывой беларускай гаворкі, — тлумачу яму я.

— Зараз я запытаюся, — хлопец знік за драўлянымі дзвярыма. Адтуль ён вывеў другога афіцыянта, які на ламанай беларускай мове прывітаўся і запрасіў усю нашу кампанію абавязкова наведаць іх кавярню. Ён запэўніў, што будзе размаўляць з намі толькі па-беларуску.

## Сіндром «сабакі»

Выпіць гарбаты ці кавы ў кавярні «Маэстра» таксама праблематычна. Асабліва з цукрам.

— З чым, з чым вам чаю наліць? — перапытвалі мяне хлапцы за барнай стойкай.

Калі я папрасіла беларускамоўнае абслугоўванне, то хлопцы адказалі, што ў іх сіндром «сабакі». Разумець-то яны разумеюць, але размаўляць не могуць.

У самым масавым месцы цэнтра — «Макдональдсе» — я пяць хвілін прасіла прынесці мне гарбату, і толькі на шостай касір, здагадаўшыся, выдала: «А-а-а, чай вам нужен!».

Пасля майго аповеду пра сяброў з Нямеччыны, якія прыехалі гасцяваць і не чулі жывой беларускай гутаркі, афіцыянтка кавярні «Абрыкос» толькі ўздыхнула.

— Ведаеце, я з цяжкасцю вас разумею, — прызналася дзяўчына, — Я проста з Расіі сама. У нас, у прынцыпе, і беларусы не зусім разумеюць па-беларуску, думаю, у гэтай змене наўрад ці вам хто зможа дапамагчы.

Афіцыянтка «Фрайдзіса» доўга моршчыла лоб на словазлучэнне «гарбата з цукрам». Пасля размовы з адміністратарам мяне нарэшце зразумелі. Пра абслугоўванне па-беларуску нават не было і слова.

Супрацоўнікі кавярні «Шокалэнд» у гандлёвым цэнтры «Сталіца» ведаюць, што такое і кава, і гарбата, аднак па-беларуску з наведвальнікамі размаўляць не могуць.

— Прабачце, але я баюся, што мая беларуская мова будзе гучаць настолькі ненатуральна, што гэта будзе ганебна для Беларусі. Таму што моўнай практыкі зусім не маю, хоць і беларус, — адказвае бармен.

Без праблем зразумелі мяне і сказалі, што могуць абслужыць па-беларуску ў невялічкіх кавярнях «Стары Менск» і «Лондан».

— Яна пастараецца размаўляць з вамі па-беларуску, — усміхнуўшыся дзяўчыне за барнай стойкай, адказаў на маю просьбу наведвальнік кавярні.

Такім чынам, з 10 кавярняў, якія я абышла, выдатна зразумелі мяне ў чатырох, у астатніх беларуская мова выклікала цяжкасці для разумення. Пагадзіліся на абслугоўванне па-беларуску тры кавярні. У астатніх адмаўляліся. І ні ў адной кавярні мне не адказалі на роднай мове. Нягледзячы на тое, што гэта цэнтр сталіцы Беларусі...

**Настасся ЗАНЬКО.**

**Алена ТУР, студэнтка БДУ, аматарка кавярняў і беларускай мовы:**

*— Звычайны наведвальнік у такой сітуацыі мала што зменіць, на мой погляд. Ну, што я магу рабіць? Плюнуць і пайсці ў іншую кавярню, але мне тады прыйдзецца доўга хадзіць. Альбо напісаць скаргу, каб прэміі афіцыянтаў пазбавілі. Магчыма, яны тады задумаюцца. Таму што ў нас дзве дзяржаўныя мовы, мяне павінны разумець. Гэта ў стане змяніць той жа гарвыканкам. Напрыклад, увесці абавязковы моўны тэст перад прыёмам на працу ў сферу абслугоўвання...*

# Інфармацыя аб рэспубліканскім конкурсе для прызначэння стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным на 2011 год

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11.08.2005 г. № 367 «Аб удасканальванні стымулявання творчай працы маладых вучоных» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2005 г., № 127, 1/6693; 2006 г., № 56, 1/7416; 2009 г., № 110, 1/10683; 2010 г., № 29, 1/11361) зацверджаны 100 стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным, якія працуюць у арганізацыях, што выконваюць навуковыя даследаванні і распрацоўкі ў галіне прыродазнаўчых, тэхнічных, сацыяльных і гуманітарных навук (далей — стыпендыі). Стыпендыі прызначаюцца тэрмінам на адзін каляндарны год у памеры, які вызначаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь на падставе прапановы спецыяльна створанай Міжведамаснай камісіі.

1. Для ўдзелу ў конкурсе вылучаюцца кандыдатуры дактароў навук ва ўзросце **да 45 гадоў**, кандыдатаў навук — **да 35 гадоў**, вучоных без ступені — **да 30 гадоў** (па стане на 1 студзеня года, у якім ажыццяўляецца вылучэнне), якія дасягнулі найлепшых вынікаў у навуковай, навукова-тэхнічнай, інавацыйнай дзейнасці.

2. Пры вылучэнні кандыдатур таленавітых маладых вучоных для ўдзелу ў конкурсе ўлічваюцца іх дасягненні ў прыярытэтных напрамках фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў і навукова-тэхнічнай дзейнасці, унёсак у сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь. Вынікі даследаванняў вучоных павінны адпавядаць наступным крытэрыям (аднаму або некалькім):

адкрыццё раней невядомых заканамернасцяў, атрыманне прынцыпова новых навуковых вынікаў, распрацоўка новых навуковых тэорый і канцэпцый, якія атрымалі практычнае пацвярджэнне і (або) прызнанне ў Рэспубліцы Беларусь і (або) за мяжой;

распрацоўка новых спосабаў, прыстасаванняў, рэчываў, штамаў мікраарганізмаў, культур клетак раслін і жывёл, карэннае іх удасканальванне або прымяненне па новым прызначэнні (пацвярджаецца патэнтамі на вынаходку) і іх укараненне ў практыку;

стварэнне аб'ектаў новай тэхнікі (спосабаў, прыстасаванняў, тэхналагічных працэсаў), якія па большасці тэхнічных параметраў адпавядаюць сусветнаму ўзроўню або пераўзыходзяць яго (пацвярджаецца патэнтамі на вынаходку), і іх укараненне ў практыку.

Названыя крытэрыі ўлічваюцца ў дачыненні да таленавітых маладых вучоных наступным чынам:

**дасягненні дактароў навук** павінны ўключаць поўны цыкл работ — ад навуковай ідэі да практычнай рэалізацыі і (або) прызнання вынікаў даследаванняў у Рэспубліцы Беларусь і (або) за мяжой;

**дасягненні кандыдатаў навук** павінны мець важнае навуковае і прыкладное значэнне — практычнае пацвярджэнне і (або) прызнанне вынікаў даследаванняў у Рэспубліцы Беларусь і (або) за мяжой;

**дасягненні маладых вучоных без ступені** павінны выражацца ва ўдзеле ў распрацоўцы ідэі, якая мае важнае навуковае і (або) практычнае значэнне, у правядзенні фундаментальных і (або) прыкладных даследаванняў, накіраваных на яе пацвярджэнне і (або) практычную рэалізацыю.

3. Вылучэнне кандыдатур ажыццяўляецца арганізацыямі па асноўным месцы працы таленавітага маладога вучонага, на сходзе навуковых работнікаў або навукова-тэхнічным (вучоным) савеце на падставе рэкамендацыі калектыву работнікаў структурнага падраздзялення, дзе ён працуе. Пры вылучэнні кандыдатур улічваюцца **водзывы не менш як двух незалежных экспертаў**, якія прыцягваюцца гэтай арганізацыяй.

У водзыве незалежнага эксперта павінна быць адлюстравана:

актуальнасць тэмы навуковых даследаванняў і яе адпаведнасць прыярытэтным напрамкам фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў і навукова-тэхнічнай дзейнасці;

атрыманыя вынікі і іх практычная значнасць;

укараненне атрыманых вынікаў з пазначэннем эканамічнага эфекту (пры наяўнасці);

адпаведнасць атрыманых вынікаў крытэрыям, устаноўленым для дасягненняў маладых таленавітых вучоных гэтай намінацыі;

колькасць публікацый (артыкулы ў замежных выданнях, артыкулы ў рэспубліканскіх рэцэнзуемых выданнях, манаграфіі і іншыя выданні, патэнты, аўтарскія пасведчанні, рацпрапановы);

удзел у міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях;

матываванае абгрунтаванне прызначэння стыпендыі ў выглядзе фармулёўкі.

Рашэнне сходу навуковых работнікаў, пасяджэння навукова-тэхнічнага (вучонага) савета з'яўляецца сапраўдным, калі ў галасаванні ўдзельнічала не менш як 2/3 навуковых работнікаў або членаў навукова-тэхнічнага (вучонага) савета. Рэкамендаванымі лічацца кандыдатуры, якія атрымалі больш як 2/3 галасоў навуковых работнікаў або членаў навукова-тэхнічнага (вучонага) савета, якія ўдзельнічаюць у галасаванні.

4. Арганізацыі, якія рэкамендуюць кандыдатуры для прызначэння стыпендый, падаюць па кожнай з іх хадайніцтвы, да якіх дадаюцца наступныя дакументы:

выпіска з пратакола сходу навуковых работнікаў або пасяджэння навукова-тэхнічнага (вучонага) савета арганізацыі аб вылучэнні кандыдатуры для прызначэння стыпендыі з паказваннем вынікаў галасавання, матываваным абгрунтаваннем дасягненняў таленавітага маладога вучонага ў выглядзе **фармулёўкі, за што рэкамендуецца прызначыць стыпендыю** ў строгай адпаведнасці з крытэрыямі, названымі ў частках 2, 3, 4 пункта 2 (пададзеная фармулёўка з'яўляецца абгрунтаваннем для прызначэння стыпендыі і ў працэсе разгляду можа быць падвержана толькі рэдакцыйным праўкам)[1];

справаздача аб навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці таленавітага маладога вучонага, зацверджаная кіраўніком арганізацыі па месцы яго асноўнай працы;

водзывы двух незалежных экспертаў;

спіс апублікаваных кніжных выданняў, навуковых артыкулаў, патэнтаў і аўтарскіх пасведчанняў таленавітага маладога вучонага (копіі патэнтаў і аўтарскіх пасведчанняў дадаюцца) за апошнія тры гады, падпісаны гэтым вучоным і засведчаны кіраўніком арганізацыі;

дакументы, якія пацвярджаюць укараненне навуковых вынікаў у розныя галіны эканомікі, іншыя сферы дзейнасці і сведчаць пра асабісты ўнёсак таленавітага маладога чалавека (даведкі і (або) акты аб укараненні вынікаў даследаванняў);

звесткі пра таленавітага маладога вучонага: яго прозвішча, імя, імя па бацьку, дзень, месяц, год нараджэння і месца нараджэння (з дадаткам ксеракопій старонак пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, якія ўтрымліваюць анкетныя звесткі маладога вучонага); адукацыя (якую ўстанову, што забяспечвае атрыманне вышэйшай адукацыі, закончыў і калі), спецыяльнасць па адукацыі; вучоная ступень і вучонае званне; месца працы (назва арганізацыі і яе месцазнаходжанне ў адпаведнасці з установчымі дакументамі, службовы тэлефон); займаемая пасада (з называннем года яе заняцця); знаходжанне за мяжой (краіна, перыяд знаходжання); узнагароды (з называннем даты ўзнагароджання); звесткі пра раней прызначаныя стыпендыі маладому вучонаму; праца ў мінулым (перыяд, пасада, месца працы); асноўныя кірункі навуковай дзейнасці; кіраўніцтва аспірантамі і сушукальнікамі; хатні адрас (з пазначэннем паштовага індэкса) і тэлефон (з кодам горада);

службовая характарыстыка.

Усе дакументы афармляюцца ў вызначаным парадку і падаюцца ў адным экзэмпляры ў асобным скорасшывальніку.

Арганізацыі таксама падаюць спіс рэкамендаваных кандыдатур (і яго электронную версію), які падпісаны кіраўніком арганізацыі і аформлены згодна з Дадаткам (размешчаны на сайце дзяржаўнай установы «Беларускі інстытут сістэмнага аналізу і інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай сферы» — http://belisa.org.by).

5. Дакументы на конкурс для прызначэння стыпендый на 2011 год падаюцца **да 1 ліпеня 2010 года** ў:

Нацыянальную акадэмію навук Беларусі — па кандыдатурах, рэкамендаваных арганізацыямі акадэміі, на адрас: 220072, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 66, Прэзідыум Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Тэлефоны для даведак: (017) 284 11 63, 284 24 56;

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь — па кандыдатурах, рэкамендаваных установамі, што забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі, на адрас: 220010, г. Мінск, вул. Савецкая, 9, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Тэлефон для даведак: (017) 200 52 01;

Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь — па кандыдатурах, рэкамендаваных іншымі арганізацыямі, што выконваюць навуковыя даследаванні і распрацоўкі, на адрас: 220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1, Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь. Тэлефон для даведак: (017) 294 92 70.

**У выпадку парушэння тэрміну і формы падачы названых дакументаў або падачы іх не ў поўным аб'ёме, хадайніцтвы арганізацый, якія рэкамендуюць кандыдатуры для прызначэння стыпендый, да разгляду не прымаюцца!**

Заўвага: **стыпендыі не прызначаюцца** маладым вучоным, якім у папярэдніх пяць гадоў (уключаючы год, у якім ажыццяўляецца вылучэнне) прызначаліся стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным, а таксама на дадзены год вызначаецца персанальныя надбаўкі ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 23.11.2004 № 571 «Аб удасканальванні стымулявання працы ў сферы аховы здароўя, навукі, культуры і адукацыі, унясенні змяненняў і прызнанні страціўшымі сілу некаторых указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і іх асобных палажэнняў» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2004 г., № 188, 1/6033).

[1] З узорамі фармулёвак можна пазнаёміцца на сайце дзяржаўнай установы «Беларускі інстытут сістэмнага аналізу і інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай сферы» http://belisa.org.by.

# ТУТ ЗАКАНЧВАЛАСЯ ВКЛ І НАРАДЖАЎСЯ КОСМАС

**Гісторыя Беларусі цесна пераплеценая з гісторыяй сваёй усходняй суседкі. Сярод бяскрайніх расійскіх прастораў можна знайсці не адну сотню і тысячу мясцін, тым ці іншым чынам звязаных з нашай краінай. У пошуках цікавых фактаў, звязаных з Беларуссю, карэспандэнт «Звязды» адправіўся ў былую крэпасць на заходняй мяжы Маскоўскай дзяржавы, а цяпер буйны індустрыяльны цэнтр Расіі — горад Калугу.**

## Маскоўскія законы

Ад Мінска да Калугі напрамкі каля 700 кіламетраў, але, калі дабірацца чыгункай, не абысціся без наведвання расійскай сталіцы і яе самага яскравага беларускага прадстаўніцтва. Не, гутарка зусім не пра пасольства — найбольш беларускім можна лічыць аднайменны вакзал. З розных бакоў бальзамам па вывезеным з радзімы сэрцы (не падумайце, кантрабанда органаў тут ні пры чым, па сваім асабістым сэрцы!) ліецца роднае вымаўленне, прыпраўленае хоць і фрыкатыўным, але такім гучным «Г». Беларускі вакзальны аазіс разбаўляюць хіба што людзі каўказскай нацыянальнасці, чатыры-пяць чалавек з якіх паперамення (і як бы незаўважна) абсалютна ўсім прапаноўваюць «новую мадэль мабільнага тэлефона на дзве сім-карты, з убудаваным тэлевізарам, — усяго за 85 долараў». «Незаўважных» прадаўцоў не заўважаюць, напэўна, толькі міліцыянеры, якіх тут вельмі шмат. Што ж, у кожнага свае спосабы заробку. А наш шлях кіруе на метро — у паўднёвы бок, да станцыі «Кіеўская», аздобленай гравюрамі пяцідзясятых гадоў мінулага стагоддзя. На адной з іх Пушкін (так-так, Аляксандр Сяргеевіч) з натхненнем чытае свае вершы ўкраінскім казакам. Выглядае гэта, безумоўна, звышсацыялістычна, на радасць бюсту «вечнажывога» Ільіча, які назірае за бясконцым натоўпам пасажыраў метро, але як вось быць з праўдападобнасцю сюжэта?.. Тры гадзіны чакання калужскай электрычкі на Кіеўскім вакзале ўпэўніваюць у існаванні і ўкраінскага аазіса пасярод Масквы. На месцы і каўказскія прадаўцы. Усё тая ж паслядоўнасць рэкламных слоганаў пра «тэлевізар», «дзве сім-карты» і «ўсяго 85 долараў» прымушаюць яшчэ раз азірнуцца і праверыць, а ці не занеслі ногі назад, на тое ж самае месца? Ды не, вакзал іншы, законы — тыя самыя.

Свае законы і ў хуткаснай электрычцы, якая за тры гадзіны давозіць да Калугі. Нават калі хто і хоча трошкі падрамаць падчас дарогі, у яго наўрад ці атрымаецца. Адзін за адным, снуючы з вагона ў вагон, тут праходзяць іншыя гандляры. Прапануецца абсалютна ўсё: ад стандартных «піва, чыпсы» да «эксклюзіўных кніг для найхутчэйшага развіцця вашага дзіцяці». Не абыходзіцца і без спевакоў — яны носяць з сабою акумулятар і падключаюць да яго электрагітары. Куды тут іх беларускім акустычным калегам. Ды і галасы добрыя, ажно на слязу прабівае... Прыпынак «Малаяраславец». Перад вачыма адразу ўсплываюць кадры з фільма пра Алімпіяду-80: ажно дасюль, да Малаяраслаўца (а гэта больш сотні кіламетраў ад белакаменнай), стаялі пасты міліцыі, якія забяспечвалі парадак праведзення галоўных стартаў чатырохгоддзя.



Музей касманаўтыкі.

## «Дзякуй, Леанід Ільіч!»

А вось і Калуга! Горад, пачатак гісторыі якога губляецца дзесьці ў XIV стагоддзі. Тады вялікі князь ВКЛ Альгерд не раз спрабаваў завяяваць паселішча на рацэ Ака, каб далей праз яго прабіцца да Масквы, але заўсёды цярпеў паразу. Лічыцца, што ўпершыню Калуга ўзгадваецца менавіта ў Альгердаўскай грамаце, але, як расказваюць мясцовыя жыхары, не ўсё так адназначна. У другой палове XX стагоддзя савецкія навукоўцы яшчэ вагаліся наконт канкрэтнай даты заснавання горада. Аднак сваю ролю адыграла вышэйшае кіраўніцтва. Ішоў 1971 год, калі Леанід Ільіч Брэжнеў з усёй шырынёй сваёй душы захацеў кагосьці ўзнагародзіць. Пад руку якраз трапілася Калуга. Горад атрымаў ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга і канкрэтную дату заснавання адначасова.

## Пра расійскія дарогі і не толькі

Сапраўдная асалода, якая ўзнікае пры аглядзе архітэктуры старога будынка вакзала, неўзабаве змяняецца першым сюрпрызам. Хоць які сюрпрыз, усё па-капіталістычнаму банальна — калужскае таксі ў тры разы даражэйшае за мінскае. Грамадскі транспарт (нават калі ўлічваць свежае вясеннняе падаражанне праезду ў нашай краіне) — у паўтара. Трэба яшчэ бачыць той транспарт — старэнькія тралейбусы, якія калужане ласкава клічуць «сараямі», і маленькія «пазаўскія» аўтобусы. Незразумелага выгляду кандуктары збіраюць аплату на выхадзе з салона. Не адрозніваюцца ад беларускіх толькі кіроўцы маршрутак, якія адначасова могуць прадаваць білеты, размаўляць па мабільніку, слухаць радыё і смактаць чарговую цыгарэту. Ну і, у большасці выпадкаў, не забываюць займацца сваім непасрэдным абавязкам — сачыць за дарогай.

На гэтых самых дарогах наўрад ці можна згубіцца: абсалютная большасць транспартных магістраляў горада размяшчаюцца перпендыкулярна ці паралельна адна адной. Прапусцілі паварот — нічога, можна смела збочваць на наступным, і непазбежна трапіш на патрэбную табе вуліцу. Цікава, гэта імператрыцы Кацярыне падабаліся такія правільныя і зразумелыя формы? Менавіта яна, надаўшы Калузе губернскі статус, падчас свайго візіту ў другой палове XVIII стагоддзя зацвердзіла генеральны план забудовы гораду. Тут дзейнічала каля 120 маленькіх прадпрыемстваў, мясцовыя майстры драўляных вырабаў славіліся далёка за межамі паселішча. Цяжка нават уявіць, але па абароту фінансавых сродкаў горад у той час ішоў на адным узроўні з Масквой і Санкт-Пецярбургам! З паўночнай сталіцай Расіі Калугу звязвае яшчэ адзін, не чужы і для Беларусі, факт. Пра гэта трошкі ніжэй.

## Шляхамі Ілжэдзмітрыя II

За паўтара стагоддзя да Кацярыны зямля калужская праславілася сумнавядомым Ілжэдзмітрыем II, які ўпершыню аб'явіўся ў беларускім мястэчку Прапойск (цяпер г. Слаўгарад), а ўжо потым, разам з войскамі Яна Сапегі, змагаючыся супраць Васіля Шуйскага, падарожнічаў паміж Тушынам, Масквой і Калугай. У апошняй яго і забілі. На месцы магілы самазванага цара, пасярод сучаснага парку культуры і адпачынку, размяшчаецца Траецкі кафедральны сабор. Вось ён і перакідвае абяцаны масцік (ці, па-Пятроўску — прасякае акно) у Піцер. Купал гэтага храма другі па велічыні ў краіне пасля падобнага піцерскага. Не саступае па ўзроўню сталічным і Калужскі абласны драматычны тэатр. Наватарскія пастаноўкі, накшталт п'ес Шэкспіра, праз культуру хіпі перамяжоўваюцца з класічным «Рэвізорам». Не абыходзіць бокам тэатр і мясцовы губернатар, для якога заўсёды зарэзерваванае месца ў партэры.



Старая Калуга.

## Касмічныя караблі і зямныя аўтамабілі

Прайшоўшыся па большай частцы горада пехатою (маштабы тут адносна невялікія, і спакойна можна з аднаго краю да другога дайсці нетаропкай хадой хвілін за сорак, цяжка не заўважыць вялікую колькасць падобных адна да адной шыльдачак на дамах. І надпісы амаль аднолькавыя: «З такога-та па такі год у гэтым доме жыў/працаваў/выкладаў (патрэбнае падкрэсліць) вядомы рускі навуковец Канстанцін Эдуардавіч Цыялкоўскі». І сапраўды, большасць навуковых прац Цыялкоўскім за апошнія чатыры дзясяткі гадоў свайго жыцця напісаў менавіта ў Калузе. Як любяць расказваць калужане, Цыялкоўскі, ужо ў даволі сталым узросце, любіў ездзіць па горадзе на ровары. У музеі нават захаваліся фотаздымкі: дзядок з сівой барадой бадзёра круціць педалі. Магіла Канстанціна Эдуардавіча знаходзіцца пасярод парку, недалёка ад Акі, а над самой ракой узвышаецца дакладная копія (у натуральную велічыню) касмічнага апарата «Усход-1», на якім першы чалавек паляцеў у космас. Сам Гагарын таксама прыязджаў у Калугу: у маі 1961 года заклаў першы камень у падмурак музея касманаўтыкі, які дагэтуль з'яўляецца адным з самых прывабных месцаў для турыстаў. Неабходна заўважыць, што і на гарадскім гербе размешчаны першы савецкі спадарожнік. Сапраўдная калыска касманаўтыкі!

Калі ў часы СССР 90 працэнтаў прамысловасці горада вызначалі абаронныя прадпрыемствы, то цяпер асноўны прыбытак атрымліваюць куды больш мірным шляхам. У 2007 годзе пачаў працаваць аўтамабільны завод Volkswagen, пачатак 2009-га азнаменаваўся адкрыццём завода Volvo, а праз год пачнецца выпуск машын Peugeot і Mitsubishi. Паводле задумкі, Расія павінна перайсці на больш танныя іншамаркі сваёй жа зборкі.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)**

ШАРКОВЩИНСКОЕ РАЙОННОЕ ПОТРЕБИТЕЛЬСКОЕ ОБЩЕСТВО

## ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже здания прирельсового склада, расположенного по адресу: Витебская обл., г.п. Шарковщина, ул. Вокзальная, 1.**

**Состав имущества:**

| Наименование строения, год постройки | Характеристика строения | Назначение строения | Общая площадь строения |
|---|---|---|---|
| Здание прирельсового склада, 1966 | крыша — волнистая, фундамент — бутобетон, стены — кирпичные, пол — дощатый | Здание специализированное складов, хранилищ | 1 232,9 кв. м |

Земельный участок для содержания и обслуживания здания — 0,1862 га.

Начальная цена — 122 157 914 бел. руб. с НДС.

Размер задатка — 12 215 791 бел. руб. Аукцион состоится 23.04.2010 г. в 08.00 по адресу: Витебская обл, г.п. Шарковщина, ул. Краснодворская, 1. Заявления на участие и необходимые документы принимаются ежедневно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по 22 апреля 2010 года до 13.00.

Договор купли-продажи заключается не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 3 апреля 2010 г.

Контактные телефоны: **(802154) 4 12 31, 8029 127 46 93**, смотрите информацию на сайте www.minsk-region.gov.by в разделе «Аукционы».

УНП 300032909



КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»
(организатор аукциона)
ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «ОРГПИЩЕПРОМ» (продавец)

## ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже автомобиля ГАЗ 33021, 1998 г.в. (бортовой тентовый).**

Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 3 909 266 бел. руб. Задаток – 10 % от начальной цены. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 17.02.2010. Аукцион состоится **28.04.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 27.04.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.



**Уважаемые акционеры ОАО «Завод гидравлического машиностроения» г. Кобрин.**

ОАО «Завод гидравлического машиностроения» г. Кобрин извещает акционеров, что выплата дивидендов за 2009 год будет осуществляться с 21 апреля по 31 июля 2010 года в следующем порядке:

акционерам — физическим лицам — почтовым переводом или путем перечисления на вкладные счета;

юридическим лицам — путем перечисления на расчетный счет.

УНП 200093330


Падпіска-2010

# ПРЫЗЫ — НАЙБОЛЬШ АДДАНЫМ ПАДПІСЧЫКАМ

**Паважаныя падпісчыкі! Як мы і абяцалі, у сённяшнім нумары «Звязды» мы друкуем спісы пераможцаў латарэі па выніках падпіскі на першае паўгоддзе і 2-гі квартал 2010 года і некаторыя падрабязнасці розыгрышу.**

**Вельмі прыемна адзначыць, што кола шчаслівчыкаў мае шырокую геаграфію. А гэта значыць, што падчас новай падпісной кампаніі, якая ўжо не за гарамі, звяздоўцы наведаюць самыя аддаленыя куткі нашай краіны.**

**Просім прабачэння ў тых, у чые прозвішчы ці назвы населеных пунктаў узкралася недакладнасць — не ўсе купоны запоўненыя разборліва.**

**Упэўненыя, што ў бліжэйшы час пашанцуе тым, каму фартуна да гэтае пары не ўсміхнулася. Выпісвайце газету «Звязда», не забывайце родную мову, чытайце па-беларуску.**

**Да сустрэчы!**

**Кар. «Звязды».**

*14 красавіка 2010 года адбыўся розыгрыш прызавога фонду рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду», арганізатарам якой з'яўляецца ўстанова «Рэдакцыя газеты «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.*

*Рэкламная гульня «Падпішыся на «Звязду» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 26 лютага 2010 года (пасведчанне № 1639) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 2 сакавіка па 30 чэрвеня 2010 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» другога квартала або першага паўгоддзя 2010 года.*

*Удзел у гульні прыняў 1191 падпісчык газеты «Звязда». Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.*

**Прызы сярод удзельнікаў гульні размеркаваліся наступным чынам:**

**электрачайнікі FA-5481 выйгралі:**

**Віннік Лілія Анатольеўна,** *г. Ганцавічы,*
**Пашковіч Святлана Міхайлаўна,** *Глыбоцкі раён, в. Кішы,*
**Старыкаў Анатоль Ільіч,** *г. Гомель,*
**Камар Алена Юльянаўна,** *Навагрудскі раён, в. В.Вераб'евічы,*
**Латушкіна Надзея Фёдараўна,** *г. Горкі,*
**Шарко М.З.,** *г. Салігорск,*
**Пішчулін Уладзімір Сяргеевіч,** *г. Мінск*

**DVD-прайгравальнікі «Віцязь-689» выйгралі:**

**Гарачко Марыя Рыгораўна,** *г. Драгічын,*
**Субач Лія Канстанцінаўна,** *г. Глыбокае,*
**Грамовіч Ганна Іванаўна,** *Мазырскі раён, в. Мялешкавічы,*
**Козел Надзея Паўлаўна,** *Смаргонскі раён, в. Сукневічы,*
**Кузьмянкоў Васіль Мікалаевіч,** *Горацкі раён, в. Красуліна,*
**Няхайчык Аляксандра Іванаўна,** *г. Барысаў,*
**Баяровіч Яўген Васільевіч,** *г. Мінск*

**тэлевізары «Віцязь 54CTV760-7» выйгралі:**

**Гатоўчыц Ірына Вячаславаўна,** *Ляхавіцкі раён, в. Крывошын,*
**Багель Марыя Іванаўна,** *г. Наваполацк,*
**Лісоўская Надзея Васільеўна,** *Жыткавіцкі раён, г. Тураў,*
**Лукашэвіч Васіль Васільевіч,** *Навагрудскі раён, в. Канцэвічы,*
**Новікава Раіса Мікалаеўна,** *Бабруйскі раён, в. Слабада,*
**Баркоўская Таццяна Анісімаўна,** Смалявіцкі раён, *в. Жажэлка,*
**Жэбрак Міхаіл Вікенцьевіч,** *г. Мінск*

**мікрахвалевую печ Daewoo KOR-6335A выйграў**

**Трухноў Валерый Міхайлавіч,** г. Мядзел

**суперпрыз — кухонны камбайн Braun K 600 — выйграла**

**Апраніч Ніна Уладзіміраўна,** *г. Узда.*

**Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні: (017) 287 19 68.**

# ПАДЛЕТАК І «МЕРСЕДЭС»


Фота Магілёўскай ДАІ.

**У Магілёве за руль бацькоўскага аўтамабіля сеў 16-гадовы падлетак: у выніку 3 чалавекі ў бальніцы, а 17-гадовая дзяўчына загінула на месцы.**

Дарожна-транспартнае здарэнне, якое адбылося 14 сакавіка, шакіравала абласны цэнтр. Вучань 10 класа вырашыў пракаціць сваіх сяброў і ўзяў «мерседэс-бенц» без бацькоўскага дазволу. Натуральна, што ў маладога чалавека не было ні вадзіцельскага пасведчання, ні вопыту ваджэння. Але на шыкоўным аўтамабілі падлеткавая кампанія рушыла па гарадскіх вуліцах.

— Каля 15 гадзін аўтамабіль на праспекце Шмідта на вялікай хуткасці ўдарыўся ў светлавую апору, — расказала **інспектар аддзялення агітацыі і прапаганды Магілёўскай ДАІ Вольга ВЯРШУБСКАЯ**. — «Мерседэс» разляцеўся на кавалкі, якія былі раскіданыя ў радыусе 60 метраў. Аднак куча пакарабачанага металу, якая засталася ад аўтамабіля, — гэта яшчэ не самае горшае. Вадзіцель 16 гадоў і два яго 17-гадовыя сябры шпіталізаваныя з чэрапна-мазгавымі траўмамі, пераломамі і ўдарамі. А 17-гадовая дзяўчына, якая ехала на пярэднім сядзенні, загінула на месцы. Самы моцны ўдар ад сутыкнення прыйшоўся менавіта на яе бок, і шанцаў, нягледзячы на падушку бяспекі, якая спрацавала, выжыць не было. Трагедыя!

ДАІ звяртаецца да маладых людзей з заклікам клапаціцца пра сваю бяспеку, каб не парушыць сваё жыццё і іншых людзей. У дачыненні да 16-гадовага вадзіцеля распачата крымінальная справа.

**Ілона ІВАНОВА.**

# МАШЫНА ЗГАРЭЛА РАЗАМ СА СМЕЦЦЕМ



Каля могілак у вёсцы Ямпаль Рэчыцкага раёна пакінуў свой аўтамабіль «Аўдзі» мясцовы жыхар. Пакуль прыбіраўся, не заўважыў, як полымя ад травы і смецця, што спальвалі побач, перакінулася на яго машыну. Аўто знішчана практычна цалкам, — паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС. Між тым, супрацоўнікі гэтай службы адзначаюць, што ў рэгіёне апошнім часам узрасла колькасць пажараў, што ўзніклі пасля выпальвання травы і смецця. Па апошніх дадзеных, выпалена каля 8 га кустоўя і 0,5 га лесу. Служба выратавання звяртае ўвагу насельніцтва на недапушчальнасць дзеянняў, якія шкодзяць экалогіі, а таксама могуць прывесці да знішчэння маёмасці і чалавечых ахвяраў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# АТРУЦІЛІСЯ ПАРАМІ ХЛОРУ Ў ДВАРЫ

З прыкметамі атручэння ў Маладзечанскую цэнтральную раённую бальніцу былі шпіталізаваныя жыхарка горада і яе пляменніца з дачкой. Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, пацярпелі яны ў выніку здарэння, якое адбылося ў двары суседа жанчыны, 73-гадовага пенсіянера. Апошні пры дапамозе адразной машынкі разрэзаў металічны балон ёмістасцю 40 літраў, у ім знаходзіўся вадкі хлор. Адбылася ўцечка яду, парамі якога і атруціліся тры чалавекі. У гаражы суседа быў знойдзены яшчэ адзін балон з хлорам.

**Ігар ГРЫШЫН.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»
(организатор аукциона)
ПО ПОРУЧЕНИЮ СПК «АГРОФИРМА «ЛУЧНИКИ» (продавец)

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже здания склада стройматериалов, об. пл. 45,7 кв.м, расположенного по адресу: Слуцкий район, Серяжский с/с, д. Лучники, ул. Производственная, 1.**

Начальная цена с НДС – 15 000 000 бел. руб. Площадь земельного участка 0,2350 га. Задаток в сумме 1 500 000 бел. руб. перечисляется на **р/с № 3012020200010 в Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **18.05.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.05.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.



ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «КОПЫЛЬСКИЙ МАСЛОСЫРЗАВОД»
КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»
(организатор аукциона)

## ПРОВОДИТ ОЧЕРЕДНОЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже имущества Столбцовского производственного участка ОАО «Копыльский маслосырзавод» расположенного по адресу: г. Столбцы, ул. Свердлова, 3, в составе зданий:**

производственное здание, об. пл. 2919,0 кв.м, производственно-вспомогательный цех, об. пл. 423,0 кв.м, здание котельной, об. пл. 261,5 кв.м, здание компрессорной, 201,7 кв.м, здание прачечной, об. пл. 109,6 кв.м, автогараж, об. пл. 156,3 кв.м, здание моечной автомолцистерн, об. пл. 493,4 кв.м, здание ТП 27, об. пл., 60,8 кв.м, воздушная компрессорная, об. пл. 38,2 кв.м, *сооружений, передаточных механизмов, оборудования* и иного имущества согласно инвентаризационной описи основных средств по Столбцовскому производственному участку на 01.06.09 г. **Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 1 700 119 485 бел. руб.** Под обслуживание объектов недвижимости сформировано два земельных участка об. пл. 0,7471 га; 0,0876 га. Задаток 100 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 02.07.09 г. Аукцион состоится **18.05.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 17.05.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.



Минский городской центр недвижимости

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 29 АПРЕЛЯ 2010 ГОДА 98-ГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

## по продаже права заключения договоров аренды (сроком на 5 лет) зданий, сооружений и помещений коммунальной собственности г. Минска

| № лота | Адрес, тип помещения, целевое назначение | Арендуемая площадь, кв. м | Начальная цена, тыс. руб. |
|---|---|---|---|
| | **КУП «ЖРЭО Заводского района г. Минска», тел. 285-56-02** | | |
| 1 | Ул. Бачило, 7, помещение расположено в техническом подполье. Под торговый объект продовольственной группы товаров, при условии согласования с санэпидемстанцией и РОЧС. | 12,6 | 2 600 |
| 2 | Ул. Варвашени, 18, комн. 3а, помещение цокольного этажа жилого дома, имеется естественное освещение, вход совместно с жильцами, отсутствует отопление, санузел. Под административные цели (офис). | 13,8 | 300 |
| 3 | Ул. Нестерова, 82, ком. 113а, помещение на втором этаже жилого дома, имеется естественное освещение, отопление, санузел, вход совместно с жильцами. Под административные цели (офис). | 16,0 | 300 |
| 4 | Ул. Красина, 31, помещение на первом этаже жилого дома, имеется естественное освещение, отопление, санузел, вход совместно с жильцами. Под административные цели (офис). | 48,8 | 900 |
| | **КУП «ЖРЭО Ленинского района г. Минска», тел. 223-35-03** | | |
| 5 | Ул. Судмалиса, 26, помещение на первом этаже, имеется естественное освещение, отопление, санузел совместного пользования, вход совместно с другими арендаторами. Под административные цели (офис). | 17,5 | 400 |
| 6 | Ул. Плеханова, 72, помещение на втором этаже, имеется естественное освещение, отопление, вход совместно с другими арендаторами. Под административные цели (офис), бытовые услуги. | 12,2 | 250 |
| | **КУП «ЖРЭО Октябрьского района г. Минска», тел. 224-53-76** | | |
| 7 | Ул. Асаналиева, 28, помещение цокольного этажа жилого дома, санузел совместного пользования. Под административные цели (офис), бытовые услуги, кроме парикмахерской. | 12,5 | 1 000 |
| 8 | Ул. Казинца, 3, помещение на втором этаже отдельно стоящего здания, отсутствует водоснабжение. Под административные цели (офис). | 57,1 | 1 000 |
| | **КУП «ЖРЭО Партизанского района г. Минска», тел. 294-01-11** | | |
| 9 | 2-й пер. Багратиона, 20, три помещения на первом этаже (в одном помещении отсутствует естественное освещение), имеется отопление, естественное освещение, общий вход с другими арендаторами. Под оказание бытовых услуг (ремонт и пошив швейных изделий) | 58,7 | 1 100 |
| 10 | Ул. Первомайская, 20, корп. 2, помещение на первом этаже, имеется естественное освещение, отопление, санузел, общий вход с другими арендаторами. Под административные цели (офис). | 12,7 | 250 |
| | **КУП «ЖРЭО Первомайского района г. Минска», тел. 285-72-92** | | |
| 11 | Ул. Городецкая, 70, помещение на первом этаже. Для размещения головной станции кабельного телевидения. | 2,3 | 480 |
| 12 | Ул. Кедышко, 27, площадь в фойе первого этажа здания УП «ЖРЭО Первомайского района г. Минска». Для размещения автомата по продаже горячих напитков. | 2,0 | 420 |
| | **КУП «ЖРЭО Советского района г. Минска», тел. 292-74-31** | | |
| 13 | Ул. Куйбышева, 91, помещение на первом этаже, имеется естественное освещение, отопление, санузел совместного пользования, общий вход с другими арендаторами, требуется ремонт. Под административные цели (офис). | 51,8 | 1 000 |
| 14 | Пр. Независимости, 46, помещение на втором этаже, имеется естественное освещение, отопление, санузел, общий вход с жильцами дома, требуется ремонт. Под административные цели (офис). | 117,5 | 2 100 |
| | **КУП «ЖРЭО Фрунзенского района № 1 г. Минска», тел. 204-30-46** | | |
| 15 | Ул. Пушкина, 29, помещение на первом этаже жилого дома, имеется отопление, водоснабжение, электроснабжение, общий вход с жильцами, требуется замена сантехнического оборудования, перепрофилирование за счет средств арендатора. Под административные цели (офис). | 28,0 | 500 |
| | **УКС Фрунзенского района г. Минска, тел. 204-31-81** | | |
| 16 | Ул. Якубовского, 32, пом. 3, каб. 3 на втором этаже, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение, водоснабжение, Требуется ремонт. Под административные цели (офис). | 16,0 | 300 |
| 17 | Ул. Якубовского, 32, пом. 3, каб. 4 на втором этаже, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение, водоснабжение, требуется ремонт. Под административные цели (офис). | 15,4 | 300 |
| 18 | Ул. Якубовского, 32, пом. 3, каб. 21 на втором этаже, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение, водоснабжение, требуется ремонт. Под административные цели (офис). | 8,5 | 200 |
| 19 | Ул. Якубовского, 32, пом. 3, склад 15, помещение на втором этаже без естественного освещения, имеется отопление, энергоснабжение, водоснабжение, требуется ремонт. Под производственное использование. | 11,1 | 200 |
| 20 | Ул. Якубовского, 32, пом. 3, склад 16, помещение на втором этаже без естественного освещения, имеется отопление, энергоснабжение, водоснабжение, требуется ремонт. Под производственное использование. | 20,3 | 400 |
| 21 | Ул. Якубовского, 32, пом. 3, склад 17, помещение на втором этаже без естественного освещения, имеется отопление, энергоснабжение, водоснабжение, требуется ремонт. Под производственное использование. | 5,4 | 100 |
| 22 | Ул. Якубовского, 32, пом. 3, склад 24, помещение на втором этаже без естественного освещения, имеется отопление, энергоснабжение, водоснабжение, требуется ремонт. Под производственное использование. | 20,8 | 400 |
| 23 | Ул. Якубовского, 32, пом. 3, склад 25, помещение на втором этаже без естественного освещения, имеется отопление, энергоснабжение, водоснабжение, требуется ремонт. Под производственное использование. | 17,2 | 400 |
| 24 | Ул. Якубовского, 32, пом. 3, каб. 5-6, склад 23, помещения на втором этаже, имеется отопление, энергоснабжение, водоснабжение, требуется ремонт, перепрофилирование за счет средств арендатора. Под административные цели (офис), бытовые услуги. | 107,1 | 1 900 |
| 25 | Ул. Якубовского, 32, пом. 3, каб. 7, ком. 9-11, склад 26, каб. 28-30, помещение на втором этаже, имеется отопление, энергоснабжение, водоснабжение, требуется ремонт, перепрофилирование за счет средств арендатора. Под административные цели (офис), бытовые услуги. | 131,9 | 2 400 |
| | **КУП «Минская спадчина», тел. 226-53-04, 226-47-34** | | |
| 26 | Пл. Свободы, 2, помещения на мансардном этаже, имеется естественное освещение, отопление, санузел совместного пользования. Под административные цели (офис). | 58,5 | 1 100 |
| | **УП «Минский городской центр недвижимости», тел. 328-51-00, 222-34-42** | | |
| 27 | Пр. Победителей, 5, комната № 2 на 5 этаже. Под административные цели (офис). | 18,8 | 400 |
| | **ГПО «Коммунальное хозяйство Мингорисполкома», тел. 233-74-31** | | |
| 28 | Минский р-н, кладбище «Колодищи», специфическое сооружение – открытая асфальтированная площадка, место № 3. Для осуществления розничной торговли цветочной продукцией. | 7,59 | 780 |
| 29 | Минский р-н, кладбище «Северное – 1» (первые ворота), специфическое сооружение – открытая асфальтированная площадка, место № 2. Для осуществления розничной торговли цветочной продукцией. | 7,28 | 760 |
| | **ГП «Горавтомост», тел. 226-49-46** | | |
| 30 | Подземный пешеходный переход по пр. Независимости (около д. 78), помещение без естественного освещения и отопления. Под торговый объект (продовольственная, непродовольственная группа товаров) | 75,6 | 10 000 |
| | **ЖЭУ УДМСиБ Мингорисполкома, тел. 200-26-10** | | |
| 31 | Ул. Короля, 9, комната № 122 на первом этаже общежития, имеется отопление, энергоснабжение, отсутствует водоснабжение. Под оказание услуг проживающим (кроме ремонта обуви и услуг, требующих водоснабжения) | 14,53 | 300 |
| | **ТКУП «Минский оптовый рынок», тел. 279-40-79** | | |
| 32 | ТЦ «Купаловский», торговое место № 16. Под розничную торговлю непродовольственными товарами. | 6,3 | 650 |
| 33 | ТЦ «Купаловский», торговое место № 23. Под розничную торговлю непродовольственными товарами. | 6,0 | 630 |
| 34 | ТЦ «Купаловский», торговое место № 24. Под розничную торговлю непродовольственными товарами. | 5,9 | 620 |
| 35 | ТЦ «Купаловский», торговое место № 25. Под розничную торговлю непродовольственными товарами. | 5,9 | 620 |
| 36 | ТЦ «Купаловский», торговое место № 95. Под розничную торговлю непродовольственными товарами. | 2,7 | 500 |
| 37 | ТЦ «Купаловский», торговое место № 98. Под розничную торговлю непродовольственными товарами. | 2,9 | 500 |
| 38 | ТЦ «Купаловский», торговое место № 99. Под розничную торговлю непродовольственными товарами. | 2,4 | 500 |
| | **ТКУП «Минский комаровский рынок», тел. 331-84-00** | | |
| 39 | Ул. В. Хоружей, 8, территория сезонного (открытого) рынка, сектор 2, ряд 11, павильон 8. Под розничную торговлю продовольственными и непродовольственными товарами. | 4,0 | 840 |
| | **УП «Бытэкс», тел. 203-79-66, 306-28-41** | | |
| 40 | Ул. Ложинская, 21, два смежных помещения 39 и 40 в одноэтажном здании КБО, отсутствует естественное освещение. Имеется энергоснабжение, отопление, водоснабжение. Под ремонт и пошив швейных изделий, склад. | 7,5 | 140 |
| 41 | Ул. Руссиянова, 11, помещение 73 на втором этаже здания КБО, естественное освещение отсутствует. Имеется энергоснабжение, отопление, водоснабжение. Под склад. | 3,2 | 60 |
| 42 | Ул. Руссиянова, 11, два смежных помещения на втором этаже: № 87 – имеется естественное освещение, № 87а – без естественного освещения, имеется отопление, водоснабжение, энергоснабжение. Под административные цели (офис), производственное использование, оказание бытовых услуг. | 27,9 | 1 500 |
| 43 | Ул. Руссиянова, 11, помещение на втором этаже № 70, имеется отопление, водоснабжение, энергоснабжение, отсутствует естественное освещение. Под административные цели (офис), производственное использование, оказание бытовых услуг. | 16,9 | 1 200 |
| 44 | Ул. Руссиянова, 11, два смежных помещения 94 и 95 в подвале, имеется отопление, водоснабжение, энергоснабжение, отсутствует естественное освещение. Под склад. | 85,9 | 1 550 |
| | **ПТК УП «Чайка», тел. 281-29-19** | | |
| 45 | Ул. Пожарского, 27, помещение в здании прачечной. Под административные цели (офис). | 11,3 | 200 |
| 46 | Ул. Пожарского, 27, помещение в здании прачечной. Под административные цели (офис). | 9,8 | 200 |
| 47 | Ул. Пожарского, 27, помещение в здании прачечной. Под административные цели (офис). | 7,0 | 150 |
| 48 | Ул. Пожарского, 27, помещение в здании котельной на втором этаже. Под административные цели (офис). | 11,8 | 250 |
| 49 | Ул. Пожарского, 27, две смежные комнаты в здании котельной на втором этаже. Под административные цели (офис). | 21,3 | 400 |
| 50 | Ул. Кнорина, 55, помещение на первом этаже двухэтажного специализированного здания, имеется отопление, энергоснабжение. Сдается с оборудованием под производственное использование. | 228,8 | 4 100 |
| | **ГСКУП «Бизнес-центр «Столица», тел. 239-76-24** | | |
| 51 | Пр. Победителей, 59, помещение 403 на 4 этаже. Под административные цели (офис). | 98,3 | 1 800 |
| | **КУП «Гаражи, автостоянки и парковки», тел. 252-06-14** | | |
| 52 | Пр. Независимости, 163, автостоянка № 44, утепленный металлический гараж, имеется энергоснабжение. Для размещения пункта технического обслуживания. | 15,0 | 2 000 |
| | **КПУП «Минскреклама», тел. 252-20-89** | | |
| 53 | Ул. Захарова, 76, помещение № 7 на первом этаже административно-производственного корпуса. Под склад. | 21,14 | 400 |
| | **УП «Жилздрав», тел. 249-09-68** | | |
| 54 | Ул. Кижеватова, 60/3, изолированное помещение на первом этаже жилого дома, имеется отдельный вход. Целевое использование – за исключением мастерской по ремонту одежды, парикмахерской, продовольственного магазина. | 66,7 | 1 200 |
| 55 | Ул. Кижеватова, 60/3, изолированное помещение на первом этаже жилого дома, имеется отдельный вход. Целевое использование – за исключением мастерской по ремонту одежды, парикмахерской, продовольственного магазина. | 81,03 | 1 450 |
| 56 | Ул. Казинца, 100, изолированное помещение на первом этаже жилого дома, имеется отдельный вход. Под административные цели (офис), под торговый объект непродовольственной группы товаров или бытовые услуги населению. | 19,37 | 1 000 |
| 57 | Ул. Шабаны, 16, помещение на первом этаже общежития. Целевое использование – за исключением парикмахерской, торгового объекта по реализации товаров, бывших в употреблении, мастерской по ремонту обуви. При условии обязательного обустройства отдельного входа. | 55,1 | 1 000 |
| | **УЗ «11-я городская клиническая больница», тел. 225-87-97, 315-19-90** | | |
| 58 | Ул. Корженевского, 4, площадь расположена на первом этаже главного корпуса больницы. Для размещения аппарата по продаже средств бытового назначения (средства гигиены, товары хозяйственного обихода, парфюмерно-косметической продукции, товаров культурно-бытового назначения), товаров для здоровья. | 1,0 | 210 |
| | **УЗ «10-я городская клиническая больница», тел. 315-19-90** | | |
| 59 | Ул. Уборевича, 73, площадь расположена в холле первого этажа главного корпуса больницы. Для размещения торгового объекта по реализации оздоровительной косметики и товаров для здоровья. | 7,0 | 1 400 |
| | **УЗ «32-я городская поликлиника», тел. 272-64-94** | | |
| 60 | Ул. Голубева, 25, площади на первом и пятом этажах поликлиники. Для размещения двух вендинговых аппаратов по приготовлению горячих напитков. | 3,2 | 670 |
| | **УЗ «26-я городская поликлиника», тел. 315-19-90** | | |
| 61 | Ул. Кунцевщина, 8, площадь в холле первого этажа поликлиники. Под размещение кофейного аппарата. | 1,5 | 300 |
| | **УП «Минскметрострой», тел. 285-32-08** | | |
| 62 | Ул. Соломенная, 13, помещение в административном здании, имеется отдельный вход. Под магазин продовольственных товаров. | 129,1 | 13 000 |
| | **Филиал «Троллейбусный парк № 4», тел. 204-79-15** | | |
| 63 | Ул. Харьковская, 16, помещение в административно-бытовом корпусе на первом этаже, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение, санузел совместного пользования. Под административные цели (офис). | 14,3 | 300 |
| 64 | Ул. Харьковская, 16, помещение в административно-бытовом корпусе на первом этаже, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение, санузел совместного пользования. Под склад. | 11,2 | 200 |
| 65 | Ул. Харьковская, 16, помещение в административно-бытовом корпусе на втором этаже, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение, санузел совместного пользования. Под административные цели (офис). | 16,1 | 300 |
| | **Филиал «Минский автовокзал «Восточный», тел. 219-36-59, 219-36-56** | | |
| 66 | Ул. Ванеева, 34, помещение на третьем этаже, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение. Под административные цели (офис). | 17,0 | 300 |
| | **Филиал «Минский автовокзал «Московский», тел. 219-36-59, 219-36-56** | | |
| 67 | Ул. Филимонова, 63, помещение на первом этаже, имеется энергоснабжение, санузел совместного пользования. Под букмекерскую контору. | 10,0 | 2 100 |
| | **Филиал «Автобусный парк № 4», тел. 294-20-52** | | |
| 68 | Ул. Чапаева, 6, часть помещения в одноэтажном здании контрольно-пропускного пункта, имеется отопление, водоснабжение, энергоснабжение. Для размещения аппарата по продаже напитков. | 1,5 | 300 |
| | **ГДУП «Городские парки «Минскзеленстроя», тел. 281-65-46** | | |
| 69 | Пр. Независимости, 84, территория парка им. Челюскинцев, площадь для установки торгового киоска по производству и продаже свежевыжатых соков. | 4,5 | 940 |
| 70 | Пр. Независимости, 84, территория парка им. Челюскинцев, специфическое сооружение (площадка). Для установки аттракциона «Стерео-Лайф-Прайм» 5D. | 32,0 | 1 700 |
| 71 | Пр. Независимости, 84, территория парка им. Челюскинцев, площадка № 1. Для установки прицепа «Купава» при условии соблюдения формы «Купава», согласно образцу. Для осуществления розничной торговли. | 9,0 | 1 800 |

Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.

**Аукцион состоится 29 апреля 2010 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

**Документы на участие принимаются с 19 по 27 апреля 2010 г. в рабочее время, 28 апреля 2010 г. с 9.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются.**

Перечень и порядок подачи документов для участия в аукционе определены Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Мингорсовета от 23.09.2009 № 250.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

- перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены заявленного лота на расчетный счет № 3012024570010, филиал ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости»;
- заполняет соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения торгов, заявления на участие в торгах и об ознакомлении с объектом недвижимости, право заключения договора аренды которого выставлено на торги (осмотр объектов недвижимости обеспечивают арендодатели);
- физическое лицо предоставляет к**опию документа, удостоверяющего личность, номер лицевого счета и реквизиты банка, в котором открыт лицевой счет;** индивидуальный предприниматель – **копию свидетельства о государственной регистрации, документ с указанием банковских реквизитов, в случае отсутствия расчетного счета необходимо предоставить номер лицевого счета и реквизиты банка, в котором открыт лицевой счет;** руководитель юридического лица либо его представитель по доверенности – **копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, документ, подтверждающий полномочия руководителя, документ с указанием банковских реквизитов.**

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. Договор аренды с победителем аукциона заключается в срок, установленный законодательством и решением Мингорисполкома о сдаче в аренду.

Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан возместить УП «Минский городской центр недвижимости» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под роспись.

**Телефон для справок (017) 227 40 22. Интернет: www.mgcn.by.**




# Адзавіся, спадчынная песня


2


1


3


4


5

У гэтыя дні цэнтральная плошча Лепеля апынулася у палоне паводкі, але не той, якую вясной нясуць да прыбярэжных вуліц хвалі мясцовага возера. Тут нястомна віравала плынь па-святочнаму апранутай дзятвы, гучалі спевы, заліваліся гармонікі. У райцэнтры ладзілі III Рэспубліканскі турнір салістаў — выканаўцаў твораў народнай спадчыны. Праводзілі яго ў межах VI Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня».

Чым жа было значным свята юных шукальнікаў народнай спадчыны, што прывабіла ў невялікі гарадок віцебскага Паазер'я вядомых педагогаў, этнолагаў, фалькларыстаў, музыкантаў? Самы лаканічны адказ можна знайсці ў тэксце Палажэння аб гэтым фэсце: турнір праводзіцца ў мэтах пашырэння геаграфіі далучэння дзяцей і моладзі да гісторыка-культурных каранёў Бацькаўшчыны. Традыцыйнае народнае мастацтва здольнае значна ўплываць на фарміраванне духоўнага свету падрастаючага пакалення і пачуцця гонару за сваю Бацькаўшчыну.

Удзельнікі турніру прыбылі ў гэты маляўнічы куток Беларусі з усіх рэгіёнаў краіны — усе яны вучні гарадскіх і вясковых школ, выканаўцы твораў розных відаў і жанраў традыцыйнага мастацтва. Гэта яны ў некалькі этапаў на працягу двух гадоў адстойвалі права выступіць на заключным спаборніцтве.

Чым жа поўніцца творчая скарбонка салістаў? Кожны з іх вывучае, пераймае і папулярызуе аўтэнтычную мастацкую культуру сваёй мясцовасці. Вось, напрыклад, узорны фальклорны калектыў «Сунічкі» з Лепельскага раёна (кіраўнік Вераніка Хомбак) акрамя мясцовых песень, танцаў, гульняў прывёз на суд журы і гледачоў казкі, паданні і легенды, запісаныя ад старых вяскоўцаў. Багатая спадчына з глыбінь стагоддзяў перадаецца ад пакалення да пакалення, «Сунічкі» збіраюць гэтае багацце, творча ўзбагачаюць яго ўласнымі інтанацыямі, пластыкай.

На першы погляд, турнір стракаціць безліччу фарбаў: усюды вышыванкі, рознакаляровыя хусткі, залацяцца пад сонейкам разнастайныя саламяныя капелюшы, брылі... Але не спяшайцеся з высновамі. Згодна з тым жа Палажэннем аб турніры, характар адзення выканаўцаў народнай спадчыны строга рэгламентуецца. Ніякіх модных прычосак і гламурных сукенак! Строі салістаў павінны паўтараць традыцыйную народную вопратку сваёй мясцовасці. Валасы дзяўчат заплятаюцца ў косы і ўпрыгожваюцца касніčкамі. На нагах у хлопцаў чобаты, а ў дзявочым абутку дазваляецца мець толькі маленькі абцасік. Абавязковы кампанент строю юнакоў — капялюш ці іншы галаўны ўбор мясцовай традыцыі.

Камусьці такая строгасць можа падацца залішняй. Але каб вы бачылі, як літаральна на вачах мужнеюць хлопцы і прыгажэюць дзяўчаты, калі апранаюць строі, здаўна прынятыя ў іх родных вёсках! Варта прыгадаць Святлану Красоўскую, якая падрыхтавала да турніра паданне «Аб рэчцы», запісанае ад васьмідзесяцігадовай зямлячкі Анастасіі Самусёвай. Слухаеш яе выступленне і нібы пераносішся ў далёкія часы, чуеш даўнюю гаворку... Ці яшчэ: калі пачаўся конкурс на лепшую выцінанку і перад гледачамі расчыніліся дзверы ў свет папяровых карункаў, кожны прыкмеціў, што створаныя ўзоры — нібы працяг тых вышываных кветак і абрысаў, што аздабляюць адзенне маленькіх майстроў. У адзінай повязі паўстае перанятае і створанае нанова.

Спецыялісты высокага ўзроўню, якія працавалі ў журы турніру, адзначылі, што найбольшы плён у пераемнасці фальклору там, дзе да народнага мастацтва дзеці далучаюцца натуральным шляхам — ад носьбітаў традыцый да пераемнікаў, дзе ёсць таленавітыя настаўнікі і здольныя выканаўцы. Менавіта так творча працуе ўзорны фальклорны гурт «Берагіня» з Барысаўскага раёна (мастацкі кіраўнік Мікола Козенка, музычны кіраўнік Антаніна Абрамовіч). Народны побытавы танец, спевы, карагод, гульня сталі для выхаванцаў гэтага гурта не толькі аб'ектамі вывучэння, але і сродкамі самавыяўлення. Калектыў «Берагіні» — лаўрэат шматлікіх міжнародных фестываляў, узнагароджаны дыпломам Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах UNESCO «За значны ўклад у захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі».

Турнір адбыўся на велікодным тыдні — трэба адзначыць адпаведнасць часу яго правядзення традыцыйнаму народнаму календару. Але не толькі каляндарным супадзеннем можна тлумачыць прысутнасць у праграмах выканаўцаў хрысціянскай тэматыкі. Духоўныя законы, па якіх жылі нашы продкі, з'яўляюцца своеасаблівымі каранямі, на якіх адвеку расце дрэва народнай творчасці. Варта нагадаць выступленне школьніцы Кацярыны Стрыгі са смаргонскага дзіцячага ансамбля народнай песні «Кучарочкі»: яна прачытала запісаную ў мясцовай вёсцы легенду «Чаму вераб'я крыўдзіць нельга». Нашы продкі з роду ў род пераказвалі, што калісьці маленькі верабейка не паверыў у смерць Збавіцеля на крыжы і адзіны на ўвесь голас смела абвяшчаў-стракатаў: «Жыў! Жыў!» Вось за гэты ўчынак трэба ва ўсе часы дзякаваць шэранькай птушачцы і не крыўдзіць яе!

Зрэшты, кожнае выступленне на турніры — песня, танец, чытанне — пераканаўча сведчыла пра дабратворны ўплыў традыцыйнай спадчыны на фарміраванне поглядаў дзятвы, узбагачэнне духоўнага свету, раскрыццё творчага патэнцыялу. Ушанаванне традыцыйнай культуры мацуе культуру сучасную.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**

**На здымках:**

**1.** Дзевяцікласнік з вёскі Палата **Сцяпан Сідоранка** — выканаўца вясёлага найгрышу з прыпеўкамі і скокамі.

**2.** На сцэне турніру традыцыйны танец-гульня.

**3. Насця Матусевіч** з узорнага фальклорнага ансамбля «Лянок» атрымала дыплом першай ступені. Адно з яе выступленняў — найгрыш на вельмі рэдкім старадаўнім інструменце — парнай акарыне.

**4.** — Дзякуй за ваша майстэрства, — звяртаецца эксперт турніру, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь **Мікалай Дудчанка** да музычнага кіраўніка ўзорнага фальклорнага гурта «Берагіня» **Антаніны Абрамовіч**.

**5. Святлана Красоўская** з узорнага фальклорнага ансамбля «Рудабельскія зорачкі» прапанавала на турніры выцінанку-фіранку, якую здаўна выразалі ў рудабельскіх вёсках.

## ЗА 6 ТЫСЯЧ — 4 ГАДЫ

**Упраўленне КДБ па г. Мінску і Мінскай вобласці спыніла незаконную дзейнасць дырэктара адной з камерцыйных структур г. Мінска.**

Суд Цэнтральнага раёна г. Мінска прызнаў згаданую асобу вінаватай у падбухторванні да дачы хабару і авалоданні маёмасцю ў буйным памеры. Прызначанае пакаранне — пазбаўленне волі тэрмінам на 4 гады з канфіскацыяй маёмасці і адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму. Касацыйная скарга пакінутая без задавальнення.

Крымінальная справа за дачу хабару і махлярства была заведзеная ў дачыненні да дырэктара-хабарніка летась. Следства ўстанавіла, што падазроная асоба валодала звесткамі аб праверцы органамі фінансавых расследаванняў фактаў незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці аднаго сталічнага жыхара. Такая інфармацыя і падштурхнула дырэктара прапанаваць апошняму свае паслугі па перадачы хабару службовым асобам Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю. На працягу 2008 года зламыснік атрымаў звыш 6 тысяч долараў для аказання садзейнічання ў спрыяльным вырашэнні пытання аб спыненні праверачных мерапрыемстваў. У сапраўднасці ж дырэктар сталічнай фірмы не збіраўся садзейнічаць і не меў магчымасці вырашыць дадзенае пытанне, а проста хацеў авалодаць валютнымі сродкамі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## РОДНАЯ ЗЯМЛІЦА, ЗЯМЛЯ-КАРМІЦЕЛЬКА, МАЦІ СЫРАЯ ЗЯМЛЯ

**У традыцыйных уяўленнях шматлікіх народаў свету зямля з'уляецца адной з чатырох асноватворных стыхій паходжання свету (космагенезу), сярод якіх яшчэ былі вада, агонь і паветра. «Родная зямліца, зямля-карміцелька, маці сырая зямля» — з такімі ўзнёсла-цудадзейнымі словамі людзі звярталіся да зямлі і ў хвіліны шчасця, і тады, калі гора хіліла галаву долу.**

● Славянскія народы параўноўвалі зямлю з жанчынай, увесь земляробчы каляндар будаваўся па прынцыпе жыццёвага колазвароту жанчыны: зямля спіць, затым абуджаецца і зацяжарвае ад сакральна-магічнага акта ўздзеяння на яе (ворыва і сяўбы), дае ўраджай (а можа адказаць няўродам), стогне, плача, гневаецца за грахі людскія.

● Па ўяўленнях нашых далёкіх продкаў, зямля заўсёды надзялялася самай высокай ступенню святасці і чысціні. Яна не цярпела ніякай брыдоты і нечысці. У сувязі з гэтым яе статус быў нароўні з вадой. Напрыклад, правіла народнага этыкету патрабавала абавязкова памыць рукі перад ядой, нават калі гэта было жніво ў полі. Аднак калі там не было вады, рукі выціралі аб зямлю. Лічылася, што зямля валодае той жа ачышчальнай сілай, што і вада.

● Славянскія легенды сцвярджаюць, што старажытныя людзі доўгі час не ведалі смаку хлеба, таму што пераважна сілкаваліся пладамі дуба — жалудамі. З цягам часу нябесныя ахоўнікі навучылі іх араць і засяваць зямлю: «Гасподзь за залатым плугам ішоў, святы Пётр паганяў, Маці Божая насенне насіла і сеяла». З таго часу ўзнік земляробчы каляндар, які парадкаваў усе сельскагаспадарчыя клопаты селяніна. У ім былі сканцэнтраваныя рознабаковыя стасункі чалавека з зямлёй.

● Абуджэнне Зямлі пасля доўгага зімовага спачыну было прымеркавана да канца сакавіка або да пачатку красавіка і часцей за ўсё супадала па часе з галоўным святам гэтага часу — Дабравешчаннем. Вестка аб непарочным зачацці Дзевы Марыі дала надзею ўсяму свету на нараджэнне Збавіцеля. І нішто не магло нашкодзіць такой падзеі. З гэтага моманту ўсё толькі пачыналася. Так і зямля-карміцелька чакала, калі ў яе кінуць зерне, каб яна магла адрадзіцца новым коласам.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнемся!



**Калі ты наш мужык, калі табе даўно за сорак, а ты жывы, здаровы і практычна цвярозы... Ведай, памятай і ганарыся, ты — дэфіцыт!**

☺

— Дарагі! Што значыць «расставіць мэблю па фэн-шую»?

— Ну... Напрыклад — паставіць халадзільнік побач з камп'ютарам!

☺

**Да з'яўлення інтэрнэту чалавецтва і не падазравала, што яно складаецца пераважна з дурняў.**

☺

Дзве сяброўкі.

— Як ты прывучыла свайго мужа раней вяртацца дадому?

— Вельмі проста. Прыходзіць ён у чарговы раз за поўнач, а я і гукаю з пакоя: «Вася, гэты ты?»

— А ён?

— А ён Алесь.

☺

**Школьнікі вырашылі здаць дзве тоны макулатуры. Пагрузілі яе ў машыну, паехалі, але не ўпісаліся ў паварот. Затое заадно здалі дзве тоны металалому!**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.07 | 20.13 | 14.06 |
| Віцебск — | 5.54 | 20.05 | 14.11 |
| Магілёў — | 5.57 | 20.03 | 14.06 |
| Гомель — | 5.57 | 19.56 | 13.59 |
| Гродна — | 6.23 | 20.28 | 14.05 |
| Брэст — | 6.27 | 20.25 | 13.58 |

**Месяц**

***Маладзік 14 красавіка. Месяц у сузор'і Цяльца.***

**Імяніны**

**Пр.** *Фядоссі, Мікіты.*

**К.** *Ксеніі, Марыі, Юліі, Бенядзікта.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.






## 16 красавіка

**Дзве даты**

**1935 год** — нарадзіўся Анатоль Клышка, вядомы беларускі пісьменнік, крытык, літаратуразнаўца, педагог, заслужаны работнік культуры Беларусі. Аўтар работ па праблемах беларускага вершаскладання, «Буквара» для беларускі школ, «Беларуска-польскага размоўніка». Пераклаў на беларускую мову «Новы запавет».



**1889 год** — нарадзіўся Чарлі Чаплін, славуты англійскі кінаакцёр, рэжысёр і сцэнарыст, універсальны майстар кінематографа, стваральнік аднаго з самых славутых вобразаў сусветнага кіно — бадзягі Чарлі.

**Цытата дня:**

*«Усялякі дурань знойдзе яшчэ большага дурня, які будзе ім захапляцца».*

**Нікала Буало (1636—1711), французскі паэт.**

HONOR BANK
ОНЕРБАНК
Закрытое акционерное общество

ЗАО «ОНЕРБАНК»
*220004, г. Минск, ул. К. Цеткин, 51.*
*Тел./факс 306 25 91.*

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2010 г.**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2010 | 01.04.2009 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 169,9 | - |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 592,6 | - |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | 16 172,8 | - |
| | для торговли | 11031 | - | - |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | - | - |
| | в наличии для продажи | 11033 | 16 172,8 | - |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 30 450,2 | - |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | - | - |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | - | - |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 108,7 | - |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 4 079,1 | - |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | 51 573,3 | - |
| 11 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | - | - |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 5 471,4 | - |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | - | - |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | - | - |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 264,9 | - |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | 5 736,3 | - |
| 18 | КАПИТАЛ | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 46 710,0 | - |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | - | - |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | (-873,0) | - |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | - | - |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | 45 837,0 | - |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 51 573,3 | - |
| 26 | ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 24 143,2 | - |
| 28 | Обязательства | 1302 | 26 176,1 | - |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2010 г.**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2010 | 01.04.2009 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 517,4 | - |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 2,5 | - |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 514,9 | - |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | - | - |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 32,5 | - |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | (-32,5) | - |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | (-340,2) | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | - | - |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 458,6 | - |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 83,2 | - |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 621,3 | - |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 18,5 | - |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | - | - |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | (-873,0) | - |

**Председатель Правления** **М. Талеби Гелин Гешлаги**

**Главный бухгалтер** **Л.И. Кислюк**

**Дата подписания «15» апреля 2010 г.**

*Лицензия на осуществление банковских операций, выданная НБ РБ № 32 от 16.10.2009 г.*

# БЮРО ЗНАХОДАК

## Чаго толькі людзі не губляюць!

**Zамор'е**

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.



**Два чалавечыя чэрапы.** У 2005 годзе лонданскі службовец знайшоў у пошце пакет, а ў ім — два чалавечыя чэрапы. Паліцыя была пастаўленая на вушы, але ўсё аказалася законна — чэрапы згубіў прафесар адной з навучальных устаноў, яны былі ўсяго толькі вучэбным матэрыялам.



**Урна з прахам.** Адзін 75-гадовы чалавек вёз на пахаванне ў Германію ўрну з прахам свайго брата, і ў аэрапорце Хітроу ў яго выкралі чамадан, у якім знаходзілася гэтая ўрна. Рабаўнікі забралі сабе ўсё больш-менш каштоўнае, а ўрну папросту выкінулі. Яе знайшлі камунальныя работнікі, пасля чаго здалі ў бюро знаходак. Зыходзячы з надпісу на пасудзіне, яны паслалі запыт у Германію. Пакуль усё высветлілася, пакуль урна вярнулася да ўладальніка, прайшло 5 гадоў. «Мой брат перажыў самыя незвычайныя праводзіны» — сказаў ён.



**Сіліконавыя грудзі.** Сіліконавыя імплантанты былі забытыя кур'ерам на кругавой лініі Лонданскага метро па дарозе ў клініку. Цяпер яны з'яўляюцца ўласнасцю лонданскага бюро знаходак, і патэнцыйная ўладальніца гэтых грудзей, мабыць, не падазрае пра іх нялёгкі лёс.



**Самурайскі меч.** Цікава, хто возіць самурайскую халодную зброю ў грамадскім транспарце? Больш за тое, кім трэба быць, каб забыць меч у падземцы? Цяпер, што заканамерна, ён захоўваецца ў бюро знаходак метрапалітэна.



**Вясельная сукенка.** Невядомы здаў вясельны ўбор, які ён знайшоў на адной са станцый метро. Прычым убор не просты, а нацыянальны — перуанскі. Можна толькі ўявіць, колькі слёз і крыўды было пры сустрэчы жаніха і нявесты...



**Сэрца.** Сэрца, памерам з чалавечае, было знойдзена на адной з аўтамыек у штаце Мэн. Мясцовы ветэрынар спрабаваў вызначыць, ці належыць гэты орган чалавеку, але не змог. Мабыць, нездарма Стывен Кінг любіць пісаць пра гэты амерыканскі штат :)



**Дарагая віяланчэль.** Вядомы віяланчэліст Е-Е Ма наведаў Нью-Ёрк з візітам 16 кастрычніка 1999 года. Па дарозе з аэрапорта ў гатэль ён узяў таксі, а пасля засялення ў гатэль высветліў, што пакінуў дарагі інструмент у аўтамабілі, які з'ехаў. Персанал гатэля неадкладна апавясціў паліцыю, і віяланчэль неўзабаве была знойдзеная і ў цэласці вернутая ўладальніку.



**10000 долараў.** Рабочыя на будоўлі ў штаце Аёва знайшлі ў смецці брыдкую бляшаную скрынку. Адкрыўшы яе, яны ўбачылі тоўсты пачак грошай на агульную суму больш за 10 тысяч долараў. На шчасце ўладальніка, рабочыя былі досыць сумленнымі і знайшлі гаспадара грошай, Джо Хэйтафа, якому вярнулі знойдзенае. А як бы вы павялі сябе ў такой сітуацыі?



**Чучала.** Гэтая цудоўная рыбка — толькі адна з мноства аналагічных, што забываюць турысты, якія вярнуліся з вандравання, у метро і наземным транспарце.



**Касцюм рабіна.** У адным з гатэляў Лондана пастаялец забыўся поўны набор рабіна, уключаючы бараду і галаўны ўбор. Таксама былі знойдзеныя фальшывае пасведчанне рабіна і некаторыя іншыя прадметы. Чамусьці ўладальнік усяго гэтага так і не звярнуўся ў адміністрацыю для таго, каб вярнуць забытае.

## Спорт-тайм

### З ПАРАЖЭННЯ НА СТАРЦЕ

З паражэння 0:7 ад шведаў стартавала юніёрская зборная Беларусі на чэмпіянаце свету па хакею, які праходзіць у Мінску і Бабруйску. Гаспадары, якія гуляюць на «Бабруйск-арэне», прапусцілі шайбы на 21-й (у меншасці), 24-й, 32-й (у меншасці), 34-й (у меншасці), 36-й, 41-й (у меншасці) і 45-й хвілінах.

Вось астатнія вынікі дня: група А (Бабруйск) — Швейцарыя — ЗША — 1:5. Становішча каманд: Швецыя — 6 ачкоў (2 гульні; розніца шайб 11-2), ЗША — 3 (2; 7-5), Швейцарыя — 3 (2; 4-6), Канада — 0 (1; 1-3), Беларусь — 0 (1; 0-7); група В (Мінск) — Латвія — Расія — 0:9, Чэхія — Славакія — 4:3. Становішча каманд: Расія — 6 (2; 13-1), Фінляндыя — 3 (1; 7-2), Чэхія — 3 (2; 5-7), Славакія — 0 (1; 3-4), Латвія — 0 (2; 2-16).

### «ВІЦЕБСК» ЛІДЗІРУЕ

У сераду адбыліся матчы трэцяга тура чэмпіянату краіны па футболе ў вышэйшай лізе. Лідары па выніках папярэдніх тураў «Мінск» і барысаўскі БАТЭ ўнічыю (0:0) згулялі на сталічным стадыёне «Дынама». Такім чынам, пасля трох тураў ніводная з 12 каманд не засталася без стратаў ачкоў, а турнірную табліцу ўзначаліў «Віцебск». Віцябчане перайгралі сталічны «Партызан» 2:0 (**на фота**), апошні ў выніку застаўся адзінай камандай без ачкоў і забітых мячоў. Першае ачко атрымала жодзінская «Тарпеда», якое ўнічыю (1:1) згуляла з салігорскім «Шахцёрам», а «Белшына» дасягнула першай перамогі, перайграўшы (1:0) брэсцкае «Дынама». Навапалацкі «Нафтан» разграміў «Днепр» — 5:0. Сталічнае «Дынама» рэабілітавалася пасля паражэння ў мінулым туры, мінімальна выйграўшы (1:0) у гродзенскага «Нёмана».

Становішча каманд: «Віцебск» — 7 ачкоў (розніца мячоў 6-2), «Мінск» — 7 (4-1), БАТЭ — 7 (3-0), «Нафтан» — 6 (8-4), «Дынама» Мн — 6 (3-2), «Шахцёр» — 5 (3-2), «Дынама» Бр — 4 (4-4), «Белшына» — 3 (1-4), «Нёман» — 2 (0-1), «Тарпеда» — 1 (3-5), «Днепр» — 1 (1-7), «Партызан» — 0 (0-4).

Чацвёрты тур пройдзе ў нядзелю, 18 красавіка.


Фота БЕЛТА.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 1827. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12